ПРОЛЕТАРЫ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ!

# ЗЬВЯЗДА

№ 136 (3244) Аўторак, 18-га чэрвеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАЧЫ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—319, кантора—781

ВАРШАВА, 17. У нядзелю адбыліся муніцыпальныя выбары ў Любліне. Урадавы сьпіс праваліўся, ня гледзячы на моцны націск з боку ўлады. Анулаваны сьпіс левага рабоча-сялянскага блёку аказаўся на другім месцы, сабраўшы 7.000 галасоў. Пілсудчыкі страцілі свае галасы, галоўным чынам на карысьць эндэкаў, а ППС—на карысьць рабоча-сялянскага блёку.

Магілеўскія і Шкпоўскія рабочыя прывезьлі з сабой праект гаспадарча-палітычнага дагавору з будаўнікамі Асінбуду.

На сходзе рабочых абрана камісія для канчатковай выпрацоўкі дагавору аб сацыялістычным спаборніцтве будаўнікоў Магілеву і Асінбуду

## Зьезд нямецкае кампартыі

### Закрыцьце зьезду.—Дэлегацыя Чырвонага саюзу франтавікоў на зьезьдзе.—Ня гледзячы на роспускі, прасьледваньні паліцыі, Чырвоны саюз франтавікоў ня спыняе сваёй работы.

БЭРЛІН, 16. На заключным пасяджаньні зьезду нямецкае кампартыі, якое адбылося ўчора ўвечары, палітычная рэзалюцыя была прынята ўсімі галасамі супроць аднаго голаса прымірэнца.

Пасьля прынятай палітычнай рэзалюцыі ў залі нечакана зьявілася дэлегацыя Вэдынгскага атраду распушчанага Чырвонага саюзу франтавікоў, якую зьезд сустрэў гучнымі авацыямі. **Дэлегацыя прышла ў забароненай форме Чырвонага саюзу франтавікоў з двума штандарамі саюзу.** Вітаючы зьезд, прамоўца дэлегацыі заявіў, што Чырвоны саюз франтавікоў Бэрліну, асабліва Вэдынгскага раёну, ня спыняе сваёй работы, ня гледзячы на роспуск і прасьледваньні паліцыі.

**Нашу форму — сказаў дэлегат — можна выгнаць з вуліц, аднак, нашу ненавісьць супроць буржуазіі—ніколі. Чырвоны саюз франтавікоў выканае свой рэвалюцыйны абавязак і застанецца непарушнай арганізацыяй пралетарскае абароны, вядучы барацьбу заўсёды поруч з нямецкай кампартыяй».**

Рэзалюцыя аб унутрыпартыйным становішчы і заява палітычнай камісіі зьезду і палітбюро аб прымірэнцах былі прыняты таксама ўсімі галасамі супроць аднаго. Заява ставіць перад падпісаўшымі пляцформу прымірэнцамі і іх прыхільнікамі наступныя патрабаваньні: адмаўленьне ад напоўменшавіцкіх поглядаў і прызнаньне фракцыйнага характару пляцформы, прад'яўленай зьезду, неадкладны роспуск фракцыі і спыненьня ўсіх групавых сувязяй, дысцыплінаванае правядзеньне ў жыцьцё і абарона пастаноў зьезду і дырэктыў кіраўніцтва партыі.

«Зьезд, — зазначаецца далей у пастанове,—даручае новае абранаму цэнтральнаму камітэту прыняць разам з Выканкомам Камінтэрну патрэбныя арганізацыйныя мерапрыемствы для забесьпячэньня адзінства партыі.

Лідэр групы прымірэнцаў Эвэрт зрабіў наступную заяву: «Мы абавязваемся не стварацъ ніякае фракцыі і груповак, аб'яднаць свае адносіны да тактыкі партыі выключна ў рамках правоў і абавязкаў, прадастаўленых ўсім членам партыі і дысцыплінавана праводзіць у жыцьцё пастанову зьезду і цэнтральнага камітэту».

Адказваючы на гэту заяву, тав. Тэльман, канстатуе, што прымірэнцы ў некаторых пытаньнях капітулявалі перад партыяй. Аднак, у гэтай заяве няма адказу на асноўнае пытаньне, а іменна, ці прызнаюць яны няправільнай пляцформу фракцыйных дакумантаў і ці адмаўляюцца ад яе. ЦК лічыць патрэбным дабіцца поўнай яснасьці ў гэтым пытаньні.

Тав. Эвэрт заяўляе, што яго група скарыстала належнае ёй права бараніць сваю думку перад зьездам партыі. Дыскусіі на зьезьдзе і пастановы зьезду — гэта пытаньне зьезду. Прадстаўлены зьезду дакумант ня будзе скарыстаны як пляцформа фракцыі і ня будзе служыць прычынаю для далейшае дыскусіі.

Тав. Тэльман канстатуе, што яснага адказу на пытаньне аб фракцыйнасьці пляцформы тав. Эвэрт ня даў.

Зьезд аднагалосна прыняў тэзісы па дакладу аб ваеннай небясьпецы і ўсімі галасамі супроць аднаго тэзісы па стратэгіі і тактыцы партыі ў эканамічнай барацьбе.

Прапанова спэцыяльнай камісіі зьезду аб пацьверджаньні выключэньня ўсіх 12-ці брандлераўцаў і 5 ультра-левых з 6, абскардзіўшых выключэньне з партыі, прынята зьездам таксама аднагалосна.

Пасьля гэтага зьезд абраў новы Цэнтральны Камітэт і цэнтральную кантрольную камісію, якія складаюцца выключна з прыхільнікаў генэральнае лініі партыі.

**Пасьля абраньня ЦК і ЦКК, тав. Гэкэрт агалашае прывітальную тэлеграму ЦК УсеКП(б). Зьезд заслухаў тэлеграму стоячы, і вітаў яе воплескамі.** Далей зьезд прыняў адозву да працоўных Нямеччыны. Зьезд закончыўся пяяньнем «Інтэрнацыяналу» і «Варшавянкі».

Макданальд заявіў, што пытаньне аб адваўленьні зносін з СССР ён мяркуе паставіць пасьля падарожжа ў ПАЗШ, дзе гэта пытаньне будзе суцольна абгаворана з Гувэрам. (З газэт).




У АМЭРЫКУ ЗА ПАРАДАЮ...

## Ангельскія меншавікі не сьпяшаюцца

### Капіталістыя ўсяго сьвету хваляць свайго Макданальда

У Англіі ўжо амаль два тыдні на чале ўлады меншавіцкі ўрад.

Меншавікі ўсяго сьвету радуюцца. Меншавіцкія газэты расьпісваюць скрозь пра сваю «сусьветную перамогу» ў Англіі. Яны заяўляюць, што гэта амаль бяскроўная заваёва ўлады рабочай клясай.

Крыві, праўда, не пралілі ні кроплі пры стварэньні меншавіцкага ўраду. Але наконт «ўлады рабочае клясы» меншавікі перабольшваюць нават у сваёй звычайнай балбатні, разьлічанай на ашуканства яшчэ асьлепленых рабочых.

Якая ўжо тут рабочая ўлада, калі капіталістыя ўсяго сьвету хваляць не нахваляцца, глядзяць, не наглядзяцца на свайго Макданальда,—галоўнага кіраўніка меншавіцкага ўраду.

Два тыдні на чале ўлады ў Англіі Макданальд, а ўсё ідзе па старому, па капіталістычнаму.

Ва ўсіх міністэрствах, ва ўсіх установах, як і раней, арудуюць ранейшыя бюракраты.

Фабрыканты таксама націскаюць на рабочых, як і раней. Нават, бадай пасьмялелі. Прынамсі, тэкстыльныя фабрыканты, якія зьбіраюцца зьмяншаць зарплату рабочых на 12,5 проц.

У ангельскай калёніі—Індыі ня спыняецца клясавая расправа над рэвалюцыйнымі рабочымі. Ангельскія суды выносяць і пры Макданальдзе катаржныя прысуды.

Макданальд і іншыя яго міністры заяўляюць:

— Мы не сьпяшаемся. Дзяржаўныя справы—тонкія справы. Мы будзем праводзіць сваю рабочую лінію паціханьку, не сьпяшаючыся.

Хлусяць, зразумела, меншавікі. Ніякай «рабочай» лініі яны праводзіць ня зьбіраюцца.

Гэта сапраўдны капіталістычны ўрад. З англа-савецкімі адносінамі Макданальд таксама не сьпяшаецца.

Ён зьбіраецца ў Амэрыку. Хоча ўбачыцца з прэзыдэнтам ПАЗШ Гувэрам. Там ён абяцае ўладаваць спрэчныя пытаньні паміж Амэрыкай і Англіяй. А заадно дакранецца і пытаньня аб адносінах да СССР і Амэрыкі і Англіі. Макданальд абяцае выступіць ледзь не дарадцаю ў пытаньні аб прызнаньні СССР Амэрыкаю.

Усё гэта меншавіцкія жартачкі. Макданальд адцягвае, як кожны капіталістычны міністр. Ангельскія рабочыя павінны напомніць Макданальду пра яго перадвыбарчыя абяцанкі -зараз-жа адновіць англа-савецкія адносіны.

## Пабудова ніжагародзкага аўтамабільнага заводу

### ЗБОРКА АЎТАМАБІЛЯЎ ПАЧНЕЦЦА 1-га СТУДЗЕНЯ.—ЗАВОД БУДЗЕ ПАБУДОВАН НА ПРАВЫМ БЕРАЗЕ РАКІ,—9 КІЛЁМЭТРАЎ АД НІЖНЯГА

МАСКВА, 17. Спэцыяльная камісія ВСНГ СССР выяжджала ў Ніжні Ноўгарад для вырашэньня пытаньня аб арганізацыі зборкі аўтамашын і выбары месца пабудовы аўтамабільнага заводу.

Тав. Талаконцаў, вярнуўшыся з Ніжняга паведаміў наступнае:

— Перш за ўсё камісія агледзіла ў Ніжнім рад заводаў для выбару сярод іх такога, які па сваіх разьмерах мог-бы быць скарыстаны для арганізацыі часовай зборачнай майстэрні. Камісія спынілася на заводзе «Гудок Кастрычніка», на тэрыторыі якога прыдзецца пабудаваць новае памяшканьне, плошчаю ў 4.000 кв. мэтраў для складу частак і поўфабрыкатаў. Прыдзецца, зразумела, пабудаваць пад'ядныя шляхі да заводу і забясьпечыць яго транспартнымі сродкамі. Усе гэтыя работы будуць каштаваць 500 тыс. руб., прычым, большая частка затрат будзе скарыстана потым заводам «Гудок Кастрычніка» ў адпаведнасьці з плянам яго папырэньня.

Усе патрэбныя работы могуць быць закончаны да 1 лістападу. З 1-га-ж студзеня 1930 году ужо можна будзе разгарнуць зборку машын.

Да 1-га чэрвеня 1930 г. мы выпусьцім на рынак ня менш 6.000 грузавых машын. Куазвы для іх будзе рабіць завод «Новая Сосна», што знаходзіцца недалёка ад заводу «Гудок Кастрычніка», або завод «Чырвонае Сормава».

Канчаткова, аднак, мы яшчэ ня спыніліся на выбары месца сборачнае майстэрні. Мы наважылі агледзіць некаторыя свабодныя заводзкія будынкіі пад Масквою.

На будучым-жа тыдні мы камандуем за граніцу на кароткі тэрмін на зборачны завод Форда аднаго інжынэра Аўтабуду для канчатковага высьвятленьня ўсіх пытаньняў па арганізацыі зборкі машын.

Эскізны праект зборачнае майстэрні мы ўжо маем, але ня выключаецца таксама магчымасьць атрыманьня праекту ў гатовым выглядзе ад Форда.

## Самая магутная домна на Урале

### ТЭЛЕГРАМА БЕЛАРЭЦКІХ РАБОЧЫХ ТАВ. СТАЛІНУ

На імя т. Сталіна атрымана наступная тэлеграма:

«Рабочыя Беларэцкага мэталюргічнага заводу вашага імя сабраліся на ўрачысты сход з повану пуску першай на магутнасьці на Урале домны на страмеэным апале. Дакладваем: некалькі спробных плавак удалыя. Домна працуе здавальняюча, прадукцыйнасьць яе—120 тон у суткі. Новы турба-генэратар у 5.100 кілёват працуе з поўнай нагрузкай. Гэтымі днямі пускаем электра-плавільную печ. Сацыялістычнае спаборніцтва ідзе поўным ходам. Прагулы зьнізіліся, прадукцыя колькасна і якасна расьце. Зьніжэньне сабекошту праведзем поўнасьцю. Адзначаем адданасьць справе партыі. Надсылаем рабочае прывітаньне Цэнтральнаму Камітэту партыі—штабу сацыялістычнага будаўніцва.

Штаб сацыялістычнага спаборніцтва

## Віды на ўраджай спрыяючыя

МАСКВА. Член калегіі Наркамзему РСФСР т. Э. І. Квірынг так характарызуе стан надвор'я і віды на ўраджай у РСФСР.

На працягу мая ў асноўных вытвараючых раёнах мы мелі досыць спрыяючыя мэтэаралёгічныя ўмовы, асабліва ў Паўночна-заходнім раёне, цэнтрально-прамысловай вобласьці, цэнтральна-чарназёмнай вобласьці на Паўночным Каўказе і ў Сібіры. Мэтэрэолёгічныя ўмовы ў Заволжжы і Казакстану прымушалі непакоіцца за лёс ураджаю. Прайшоўшыя ў першай дэкадзе чэрвеня ў раёнах Паволжжа і частцы Паўднёвага Уралу дажджы павінны спрыяць пасевам. Наогул трэба сказаць, што ва ўсіх асноўных вытвараючых раёнах мы маем спрыяючыя віды на ўраджай. Калі на працягу часу, што застаўся да жніва, ня будзе пагоршаньняў надвор'я, дык трэба чакаць ураджай ва ўсякім выпадку ня ніжэй сярэднята.

Гэта абавязвае нас ужо зараз разгарнуць работу па падрыхтоўцы ўсіх мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць сваячасовы збор ураджаю. Трэба яшчэ мець на ўвазе, што атрыманыя з месц весткі гавораць пра значнае папырэньне пасеўных плошчаў на тэрыторыі РСФСР, асабліва ў бядняцкіх гаспадарках, калгасах і саўгасах.

***

НОВАСІБІРСК, Стан пасеваў па краю ўсюды здавальняючы. Плошча пасеваў усюды папырылася, асабліва ў сацыялістычным сэктары. У Гірэнскім раёне, дзе звычайна мала сеюць, сёлета пасеў павялічан на 5 проц., у Алчынскай акрузе ня менш, як на 15 проц. Калгасы Іркуцкае акругі павялічылі пасеў на 400 проц.

## Паны непакояцца

### Магчымасьць франка-нямецкага зьбліжэньня

#### НАПЯРЭДАДНІ АДНАЎЛЕНЬНЯ АНГЛА-САВЕЦКІХ АДНОСІН

МАДРЫД, 15. У выніку перагавораў паміж Штрэзэманам, Брыянам і ангельскім пасланьнікам у Мадрыдзе Грэхэмам прынята пастанова склікаць у ліпені і жніўні дыплёматычную канфэрэнцыю па пытаньнях «ліквідацыі сусьветнае вайны». На гэтай канфэрэнцыі павінны абгаварвацца пытаньні, зьвязаныя з плянам Юнга і з эвакуацыяй рэйнскае вобласьці. Пастанова гэта падлягае афармленьню па працяту далейшых перагавораў з удзелам Італіі і Бэльгіі.

Адначасова Брыян умовіўся са Штрэзэманам аб тым, што апошні, праездам праз Парыж, будзе працягваць перагаворы з ім і Пуанкарэ па пытаньнях рэгуляваньня рэпарацый.

Ва францускіх колах лічацца з пэрспэктывай некаторага паслабленьня антла-францускага супрацоўніцтва, але пакуль яўна здаволены тым, што ўрад Макданальда фактычна ўстрымаўся ад удзелу ў Мадрыцкіх перагаворах і ня зрабіў нічога, што-б магло ўжо зараз затрудніць францускую пазіцыю. Французы ня тоўць таксама свайго здавальненьня тактыкаю Нямеччыны па пытаньні аб нацыянальных меншасьцях, якое ў выніку ўступак Штрэзэмана, надоўга зьнята з парадку Лігі Нацый.

Прыяцельскі тон у адносінах да Нямеччыны вельмі непакоіць польскія колы, якія належаць да найбольш нездаволеных вынікамі Мадрыцкае сэсіі і да таго-ж, наогул, моцна заклапочаны пераменаю ўлады ў Англіі і пэрспэктываю аднаўленьня англа-савецкіх адносін.

## Фінляндыя і СССР

ГЭЛЬСІНГФОРС, 15. Ва ўчарайшым нумары «Фінскага Сацыял-дэмакрата» зьмешчан артыкул па пытаньні аб савецка-фінляндзкім гандлёвым дагаворы. У артыкуле зазначаецца, што ў інтарэсах абедзьвюх краін неабходна імкнуцца да стабілізацыі і ўрэгуляваньня эканамічных ўзаемаадносін паміж імі. Газэта заканчвае абяцаньнем вярнуцца да гэтага пытаньня пасьля выбараў і заяўляе:

«Хто хоча гандлёвага дагавору з СССР, няхай галасуе за сацыял-дэмакратаў. «Известия Рабочий организаций» рашуча абвяргаюць абвінавачаньні буржуазнага друку па адрасу савецкіх гандлёвых прадстаўніцтваў у нелаяльнасьці.

## Паліцэйскі тэрор супроць чэха-славацкае кампартыі

БЭРЛІН, 11. Як паведамляюць з Прагі, за апошні час Чэха-Славацкі ўрад імкнецца параліжаваць дзейнасьць кампартыі сыстэматычнымі паліцэйскімі мерапрыемствамі. Вобыскі за апошні час набылі характар плянавае аблавы на перадавых і найбольш актыўных партыйных працаўнікоў. Усе вобыскі былі досыць бесспэрамонлівыя, а часта з парушэньнем законнасьці. Фармальная прычына да вобыску паслужылі пошукі брашуры з пастановамі 5-га кангрэсу КІМ'у. Фактычна-ж паліцыя забірала літаральна ўсё, што ляжала пад рукою, нават незапоўненыя блянкі партыйных білетаў.

## Сэсія Лігі барацьбы супроць імпэрыялізму

БЭРЛІН, 12. 20-га ліпеня ў Парыжы адкрываецца кангрэс Лігі барацьбы супроць імпэрыялізму (у склад яе ўваходзяць прадстаўнікі ад калёніяльных народаў, і ад рабочых арганізацый і перадавое інтэлігенцыі эўрапейскіх краін).

Цэнтральным пытаньнем работ кангрэсу будзе рэвалюцыйная барацьба ў Індыі. Ліга выступае з усёй энэргіяй за поўную незалежнасьць Індыі.

Рад дэлегатаў ад індыйскіх арганізацый ужо паведамілі аб сваім удзеле ў кангрэсе.

## Барацьба ў Аўганістане ня спыняецца

ТЭРМЭЗ, 15. Паводле атрыманых тут вестак, у Гарказе закончылася скліканая Надзір Ханам джырга (племянное веча), на якой прысутнічала дэлегацыя Бачэ-Сакао. Дэлегацыя вымагала ад Надзір-Хана яго адмаўленьня ад барацьбы супроць Бачэ-Сакао і прапанавала Надзір-Хану ад імя Хабібулы пост прэм'ер міністра і зварот яму ўсяго адабранага і канфіскаванага ў яго дабра, ў выпадку яго нежаданьня застацца ў Кабуле—назначэньне яму штогоднае пэнсіі, якая будзе высылацца яму заграніцу.

Надзір-Хан рашуча адмовіўся ад прапаноў дэлегацый і настойваў з свайго боку на адмаўленьні Хабібулы і скліканьні ў Кабуле ўсеаўганскае джыргі для выбараў эміра. Джырга выказалася на карысьць Надзір-Хана, пастанавіўшы ня прызнаваць Хабібулу і арганізаваць паход на Кабул. Урад Хабібулы накіруе зараз значныя сілы супроць Надзір-Хана.

## ПЕРАЛЁТ ПРАЗ АТЛЯНТЫКУ

ПАРЫЖ, 16. Самалёт Асолана і Лефэўра, які робіць пералёт з Амэрыкі ў Эўропу, бесперашкодна зьнізіўся на аэрадроме Ле-Буржэ.

## Поўны правал харбінскае паліцыі

### Апублікаваныя фальшыўкі—няпісьменная творчасьць расійскіх белагвардзейцаў

ХАРБІН, 14. Усе японскія газэты сходзяцца на тым, што апублікаваныя кітайскімі ўладамі дакуманты—фальшывыя і сфабрыкованы расійскімі белагвардзейцамі. Харбінская «Ніці-Ніці» зазначае, што вобыск ня даў кітайскім уладам тых вынікаў, якіх яны чакалі.

У грамадзкай думцы Манчжурыі наглядаецца значны пералом. **Шырокія колы адкрыта гіранізуюць над грубым і няўдалым актам харбінскіх улад.** У замежных дзелавых колах падкрэсьліваюць, што налёт на савецкае консульства **аслабіў прэстыж улад трох усходніх правінцый** у вачох чужаземных дыплёматаў і аслабіў пазіцыю Кітая ў барацьбе за скасаваньне экстэрытарыяльнасьці яго чужаземных прадстаўнікоў.

***

ШАНХАЙ, 16. Кітайскі напоўафіцыёзны друк, што выдаецца на ангельскай мове, вядзе наглую і правакацыйную кампанію супроць СССР. «Морнінг Пост» і «Чайна Крытык» сьцьвярджаюць, быццам савецкі ўрад усяляк прыгнятае кітайскіх грамадзян, што жывуць у СССР і што нібы-та забаронена кітайцам, якія ня маюць 500 руб. жыць у СССР. Газэты вінавачаць савецкі ўрад у тым, што ён «канфіскуе ўсю маемасьць кітайцаў, якія ад'яжджаюць з СССР». «Чайна крытык» заяўляе, што вобыскі давялі, нібы што савецкія консульствы ў Кітаі арганізоўвалі змову супроць ПАЗШ і Японіі. У той-жа час карэспандэнцыя з Харбіна, апублікаваная ў ангельскім органе «Шанхай Таймс» паказвае, што пры вобыску ў савецкім консульстве нічога ня было знойдзена і што «апублікаваныя дакуманты» зьяўляюцца самай грубай і няпісьменнай падробкаю, загадзя падрыхтаванай белагвардзейцамі і супрацоўнікамі паліцыі.

#### РОСТ ПАЎСТАНЧАГА РУХУ Ў КІТАІ

ШАНХАЙ, 10. У Паўднёвай і Заходняй правінцыі Цзянсі ўзмацнілася дзейнасьць паўстанчых атрадаў, пад кіраўніцтвам камуністых. Тэлеграфныя зносіны з цэлым радам раёнаў спынены. У Чжэнцзяне (новы галоўны горад правінцыі Цзянсу, недалёка ад Нанкіна) арыштаваны на абвінавачаньні ў камуністычнай дзейнасьці супрацоўнік аднаго з урадавых установаў, актыўны дзеяч прафсаюзаў Гао Та-чэн. З Нанкіну паведамляюць аб узмацненьні студэнцкага руху.

## Шматтысячныя мітынгі рабочых і служачых ў Парыжы

### Мільярды на ваенныя патрэбы, ні капейкі на рабочыя кватэры

#### СУПРОЦЬ ЗАКОНУ АБ ПАДВЫШЭНЬНІ КВАТЭРНАЕ ПЛАТЫ

ПАРЫЖ, 15. Фэдэрацыя кватэра-наймальнікаў, зьвязаная з унітарнай (рэвалюцыйнай) канфэдэрацыяй працы, наладзіла мітынг пратэсту супроць новага закону аб кватэрнай плаце. Закон гэты прадугледжвае паступовае павялічэньне існуючай кватэрнай платы ў 4½ разы. На мітынгу прысутнічала звыш 10.000 рабочых, служачых і рамесьнікаў Парыжу і яго прыгарадаў. Выступалі камуністычныя дэпутаты Кашэн і Клямамюс, сакратар унітарнае кафэрэнцыі Рэйно і прадстаўнік рамесьнікаў Лакур.

Прамоўцы адзначалі, што новы закон накіраван супроць працоўных і што палата, прымаючы яго, кіравалася выключна інтарэсамі дамаўласьнікаў. Прамоўцы заклікалі прысутных пры ўсякім падвышэньні кватэрнае платы, вымагаць павышэньня зарплаты. Прамоўцы зазначалі, што ва Францыі затрачаюцца мільярды на ваенныя патрэбы, у той час, як для пабудовы рабочых кватэр нічога ня зроблена. Сход прайшоў з вялікім уздымам. Удзельнікі яго разышліся з пяяньнем «Інтэрнацыяналу» і выкрыкамі «Няхай жывуць саветы».

#### ДЗЯРЖАЎНЫЯ СЛУЖАЧЫЯ ПАТРАБУЮЦЬ ПАВЯЛІЧЭНЬНЯ ЗАРПЛАТЫ

ПАРЫЖ, 15. У Парыжы адбыліся два шматлюдных мітынгі дзяржаўных служачых усіх катэгорый, а таксама чыгуначнікаў. Прысутныя на мітынгу патрабавалі вызначэньня мінімуму зарплаты ў 1.800 франкаў, прызнаньня за дзяржаўнымі служачымі права быць у прафсаюзах і прыёму на службу звольненых у час забастоўкі. На мітынгу прыняты рэзалюцыі аб узмацненьні адзінага фронту і аб барацьбе супроць дзяржавы, як прадпрыемцы, а таксама супроць прыватных чыгуначных кампаній.

## Зьлёт цэргібэляў

БЭРЛІН, 12. Як паведамляюць газэты, перагаворы начальнікаў паліцыі Лёндану, Бэрліна і Парыжу, што зараз адбываюцца ў Лёндане, павінны прывесьці да больш цеснага супрацоўніцтва паліцэйскіх апаратаў гэтых эўрапэйскіх сталіц. Як вядома, сацыял-дэмакратычны паліцэй-прэзыдэнт Бэрліна Цэргібэль знаходзіцца ў Лёндане ўжо тыдзень. Прэфэкт парыскае паліцыі прыехаў туды гэтымі днямі.

Вось—яны „рабочыя" міністры. Справа налева: Сэнкі, Клэйнс, Адамсон, Гэндэрсон, Трэвэльян.

Новыя міністры прыбраліся да паездкі ў Віндзорскі замак для прысягі ў вернасьці каралю.

## Французская ваеншчына ў Мароко

Сутычкі паміж францускім войскам і непакорлівымі плямёнамі ў Мароко прадстаўляюць сабою звычайную зьяву.

Урад і весь буржуазны друк Францыі да гэтага часу ўпарта маўчалі пра гэты факт. І толькі орган кампартыі «Юманіте» ад часу да часу зьмяшчаў кароткія весткі, якія даходзілі да рэдакцыі з зусім выпадковых крыніц.

Аднак, на гэты раз сутычкі, як відаць набылі ўжо досыць буйныя разьмеры і ўраду не ўдалося замоўчыць іх.

Пачалося з таго, што атрад францускага войска папаў у засаду, зробленую тубыльцамі.

Урадавае агэнцтва «Гавас», паведамляючы пра гэта, сарамліва растлумачыла, што атрад накіраваўся на разьведкі «наперакор загаду ваеннага камандаваньня». Можна сабе ўявіць, як сурова камандаваньне загадвае салдатам сядзець спакойна ў лягеры, а яны—такія неспакойныя—парушылі дысцыпліну і на ўласную рызыку пайшлі на сьмерць.

Зараз, аднак, ва францускім друку ўжо загучэлі іншыя ноткі.

Так, чорнасоценная газэта «Авенір» зусім проста піша, што «ваенная чынасьць, падобная да цяперашняй, патрэбна і павінна прывесьці да поўнае пакоры мяцежнікаў». Гэта кулы больш перакапаўчае тлумачэньне агэнцтва Гаваса.

Чаму-ж паўсталі «мяцежнікі»?

792 тысячы гэктараў зямлі ўжо адабраны ад мараканскіх плямён і разьмеркаваны паміж францускімі капіталістычнымі кампаніямі. І гэты драпежніцтва ня спыняецца.

У Мароко ёсьць надзвычайна багатыя палі і пашы, ёсьць амаль нечапаныя залежы руды, марганца, фасфату. Усё гэта моцна падбівае алэтыты францускіх імпэрыялістых.

Але Мароко цікавіць іх ня толькі сваімі натуральнымі багацьцямі. Мароко патрэбна ім таксама, як тэрыторыя, праз якую будзе пракладзена Транс-Сахарская чыгунка, якая мае вялізнае значэньне, перш за ўсё ваенна-стратэгічнага характару.

Чыгунка гэта павінна перасячы пустыню Сахару і злучыць францускія паўночна-заходнія калёніі ў Афрыцы (Мароко, Алжыр) з францускай Заходняй Афрыкай.

Па гэтай дарозе, а потым праз Міжземнае мора, францускі імпэрыялізм разьлічвае ў выпадку вайны дастаўляць нэграў з Заходняй Афрыкі ва Францыю. Там яны будуць папаўняць рады францускае армії.

Ужо ў мінулую вайну 150 тыс. нэграў былі кінуты ў імпэрыялістычную мясарубку. З іх 30 тысяч былі забіты і 40 тысяч засталіся калекамі на ўсё жыцьцё.

Але тады нэграў прыходзілася дастаўляць праз Атлянтычны акіян. Кожная такая перавозка цягнулася амаль цэлы месяц і знаходзілася заўсёды пад пагрозаю з боку варожых падводных лодак.

Пасьля-ж пабудовы Транс-Сахарскае чыгункі адлегласьць паміж Заходняй Афрыкай і Парыжам можна будзе пакрыць у пяць дзён. І пры гэтым морам прыдзецца ахаць толькі на параўнаўча невялікім адмежку ад Алжыру да Марсэля (порт Францыі на Міжземным моры).

Гэта дасьць францускамі імпэрыялізму магчымасьць значна шырэй скарыстаць нягрыцянскае гарматнае мяса, як гэта ён рабіў у 1914-1918 г. г.

Да пракладкі Транс-Сахарскае чыгункі мяркуецца прыступіць у 1930 г. Але чыгунка павінна будзе праходзіць праз Мароко і таму неабходна перш за ўсё ўціхамірыць засляючыя яго плямёны.

У выніку францускае войска ўсё далей прасоўваецца ў глыбіню краіны, а францускія самалёты кідаюць бомбы над мараканскім насельніцтвам.

С. М.

## ЛЕПШ МЕНШ, ДЫ ЛЕПШ

### Больш асьцярожнасьці і ўважлівасьці пры чыстцы ўстаноў

#### ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ТАВ. КАЛІНІНА НА ЗЬЕЗЬДЗЕ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ

МАСКВА, 16. На зьезьдзе саўгандальслужачых выступіў з прамоваю тав. Калінін. Ён гаварыў пра чыстку савецкіх установаў і вылучэньне новых кадраў.

— На мясцох,—кажа тав. Калінін,—часта не разумеюць значэньня і мэты чысткі. Мы ня ставім сабе мэтаю вычысьціць як мага больш народу. Мы хочам аслабаніць нашы ўстановы ад чужых і варожых нам людзей. Чыстка павінна дакрануцца пераважна працаўнікоў, якія займаюць больш-менш адказнае становішча. А на мясцох робяць наадварот. Напрыклад, у Разанскай губэрні некалькі месяцаў таму назад вычысьцілі з установаў паўтары тысячы чалавек. І чысьцілі нават кур'ераў.

Нам важна вычысьціць вялікага бюракрата, а маленьні пасьля гэтага сам паправіцца.

Пераходзячы да пытаньня аб вылучэньні, тав. Калінін кажа:

— Я гэтымі днямі даведаўся, што ў Томску было вычышчана з установаў тысяча чалавек, якія тут-жа былі заменены рабочымі. Гэты выпадак паказвае, што на мясцох не разумеюць сутнасьці работы ўстаноў. Нельга рабочага ад варштату проста пераводзіць на пасаду справавода, стэнографа, машыніста. Гэта работа патрабуе вывучэньня. Масавае, бясплянавае вылучэньне гаворыць аб папяровым падыходзе да гэтае задачы.

Успомнім словы Леніна: «Лепш менш, ды лепш».

Ва ўстановы трэба вылучаць ня толькі рабочых з заводу, але і сумленных служачых. У нашых установах ёсьць вялізныя кадры шчыра адданых супрацоўнікаў—дэмабілізаваных чырвонаармейцаў і сялян, і рабочых. Таму, пабольш асьцярожнасьці, больш уважлівасьці пры правядзеньні чысткі.

Прамова тав. Калініна была пакрыта гучнымі воплескамі.

## Па Савецкім Саюзе

### Забесьпячэньне насельніцтва хлебам у 1929-30 годзе

#### СЫСТЭМА ЗАБОРНЫХ КНІЖАК ЗАСТАЕЦЦА.—АСНОЎНЫЯ ЗАГАТОЎЦЫ ХЛЕБА.—ЗАГАТОЎНЫЯ ЦЭНЫ

МАСКВА, 17. Саюзны СНК вызначыў, што асноўнымі хлебазагатоўцамі на 1929-30 год зьяўляюцца: Саюзхлеб і Цэнтрасаюз СССР—па ўсёй тэрыторыі СССР, Хлебацэнтр і Цэнтрасаюз РСФСР—па РСФСР, Букаспілка і Сельгаспадар—па УССР, і Азіяхлеб—па рэспубліках Сярэдняе Азіі.

Па загатоўках сланэчніку асноўным загатоўцам зьяўляецца Маслажырсынтдыкат, па загатоўцы бабовых—Дзяржгандаль РСФСР і Укрдзяржгандаль.

Саюзхлеб сваю загатоўчую дзейнасьць павінен канцэнтраваць на млынах, элеватарах, на станцыях чыгунак і на прыстанях. На Саюзхлеб ускладзен абавязак ахвату ўсяго таварнага хлеба з саўгасаў і атрыманьне з млынаў, крупадзёрак і маслабоек памольнага збору.

Органы спажыўкааперацыі сканцэнтроўваюць сваю загатоўчую дзейнасьць пераважна ў аддаленых пунктах, а таксама на ўласных элеватарах і млынох. Сельгаскаапэрацыя сканцэнтроўвае сваю работу на ахваце ўсяго таварнага хлеба калгасаў і вытворчых аб'яднаньняў.

Наркамгандлю СССР пры ўстанаўленьні дырэктыўных цэн на хлеб на 1929-30 год прапанована грунтавацца на неабходнасьці захаваньня ў агульным загатоўчых цэн на ўзроўні бягучага году. Да актыўнае дапамогі выкананьня плянавых заданьняў павінна быць прыцягнута ўся сельская грамадзкасьць.

Хлебазагатоўцы ў першыя месяцы кампаніі, загатаўляючы хлеб, што паступае ў парадку кантрактацыі ад калгасаў і саўгасаў, адначасова павінны разьвіваць актыўную дзейнасьць па загатоўцы незакантрактаванага хлеба.

З усяго загатоўленага асноўнымі загатоўцамі хлеба, павінны быць створаны два фонды: фонд цэнтралізаванага і фонд нецэнтралізаванага забесьпячэньня. Першы—для здавальненьня патрэб буйных гарадоў і прамысловых цэнтраў, а другі для здавальненьня мясцовых патрэб вытвараючых раёнаў. Забесьпячэньне дробных гарадоў не прамысловага тыпу павінна будзе ажыцьцяўляцца за кошт мясцовага рынкавага звароту. Саюзны СНК прызнаў неабходным заставаць на 1929-30 год сыстэму забесьпячэньня хлебам насельніцтва па заборных кніжках і дабіцца палепшаньня якасьці мукі пры перапрацоўцы збожжа.

## Горна-кліматычная станцыя для лячэньня сухотнікаў

МАСКВА, 13. Дзяржаўныя курорты паўднёвага берага Крыму адкрываюць 21 чэрвеня ў Цюзьлеры горна-кліматычную станцыю для хворых лёгачнымі сухотамі. Знаходзіцца яна сярод сасновага лесу ў абсалютна сухой мясцовасьці ў 10 кілёмэтрах ад Ялты.

## Посьпехі калектывізацыі ў Ленінградзкай вобласьці

ЛЕНІНГРАД, 17. Калектывізацыя сялянскае гаспадаркі ў Ленінградзкай вобласьці зрабіла вялікія посьпехі. Наглядаецца моцны рост калгасаў і іншых сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў. На 1-га чэрвеня ў вобласьці налічваецца да 1.000 калгасаў супроць 584 ранейшых. Гэтыя калгасы ахапілі 140 тысяч гэктараў зямельнае плошчы. Таварная прадукцыя павялічылася з 337 тыс. руб. да 1.150.000 тыс. руб. Вялізны рост паказваюць і іншыя віды сельска-гаспадарчае каапэрацыі.

## Завочная партасьвета

МАСКВА, 17. Пры АПА ЦК УсеКП(б) адбылася нарада загадчыкаў завочнымі камунівэрсытэтамі і саўпартшколамі па пытаньні завочнае партасьветы. У дакладзе аб выніках і задачах завочнае партасьветы адзначалася, што завочнымі камунівэрсытэтамі ахоплена каля 5.000 чалавек, завочнымі саўпартшколамі—8.000 чалавек. Апрача таго, каля 5.000 сакратароў ячэек праходзіць перападрыхтоўку па завочна-курсавой сыстэме.

## Заходня-эўрапэйскі пералёт самалёту „Крыльлі

# Сьмела і настойліва вылучаць

## на кіруючую работу рабочых, бяднейшых сялян і батракоў

### Рашуча змагацца з супраціўленьнем апарату супроць вылучэнства

Кастрычнікавая рэвалюцыя заклікала мільённыя масы рабочых і сялян да непасраднага ўдзелу ў дзяржаўным кіраўніцтве.

Дзесяткі тысяч пралетараў, батракоў, беднякоў і актывістых сераднякоў-сялян як партыйных, так і беспартыйных, сталі на чале цэнтральнага і мясцовага савецкага кіраўнічага апарату. Працоўныя масы пад кіраўніцтвам ленінскае камуністычнае партыі кожны год, кожны дзень вылучалі і пасылалі новых работнікаў у саветы, выканкомы і савецкі апарат наогул.

Інакш быць не магло і ня можа, бо савецкая дзяржаўная сыстэма ня можа існаваць без прыцягненьня да справы дзяржаўнага і грамадзкага кіраўніцтва шырокіх рабочых і сялянскіх мас.

Задача удасканаленьня дзяржаўнага апарату, пастаўленая Леніным перад краінай саветаў, на працягу апошніх гадоў выпадалася партыяй і савецкай уладай са ўсёй уважлівасьцю і рашучасьцю, таму ў сэнсе паляпшэньня дзяржаўнага апарату, у параўнаньні з мінулым, **мы маем зараз вялізарнейшыя дасягненьні.**

Шляхам разгортваньня савецкае пралетарскае дэмакратыі, шляхам ажыўленьня масавай работы саветаў, шляхам вылучэньня ў савецкі апарат новых, сьвежых сіл, непасрэдна зьвязаных з вытворчасьцю, а масамі рабочых і бяднейшага сялянства, мы паляпшаем і канчаткова аздаровім савецкі апарат.

Лепшы сродак аздараўленьня апарату—гэта **вылучэньне новых кадраў** рабочых і работніц, а таксама актывістых і актывістак вёскі з бяднейшага сялянства і батракоў **на кіруючыя пасты,** на працу ў савецкім апараце. Ягчэ больш, яшчэ шырэй і глыбей трэба разгарнуць ажыцьцяўленьне лёзунгу нашай партыі—крытыкі і самакрытыкі. Весьці барацьбу з бюракратызмам да канца, да поўнай перамогі **магчыма толькі тады, калі ўсё насельніцтва будзе прымаць удзел у кіраўніцтве краінай,**—так сказаў у свой час Ленін.

У гэтым сэнсе перавыбары саветаў зьявіліся найлепшым сродкам. **Перавыбары саветаў са ўсёй сілай ударылі па бюракратызьме, нядбайнасьці і злоўжываньнях.** Склад саветаў абнавіўся на семдзесят процантаў, таксама значна абнавіліся кіруючыя кадры саветаў і выканкомаў залік партыйцаў, камсамольцаў і лепшых беспартыйных рабочых і сялян.

**На апошнім 9-м Усебеларускім зьезьдзе Саветаў выбрана у ЦВК больш ста рабочых і работніц з вытворчасьці, сялян і сялянак, з іх пяць ўвайшлі ў склад прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту.**

Не ў далёкай будучыне частка выбраных ў ЦВК таварышоў **будзе назначана на сталую працу** ў цэнтральныя ўстановы. Былыя вылучэнцы — члены ЦВК, якія ўжо прайшлі належную падрыхтоўку, часткова застануцца на далейшай кіруючай працы ў цэнтральным апараце, часткова пройдуць на самастойную акруговую ці раённую працу, а на зьмену ім прыдуць новыя таварышы, якія будуць працаваць і вучыцца кіраваць дзяржавай.

Ужо пасьля зьезду саветаў прэзыдыум ЦВК прызначыў двух таварышоў: актывістага-селяніна т. **Дубаўцова** (члена прэзыдыуму ЦВК) загадчыкам прыёмнай ЦВК, і тав. **Анішчанка,** сялянку бяднячку з Мазырскай акругі—(канд. у члены прэзыдыуму ЦВК)—для працы ў прыёмнай ЦВК; яны прыступілі ўжо да выкананьня гэтай вельмі адказнай працы.

Бюро ЦК КП(б)Б яшчэ ў мінулым годзе ў сваёй пастанове аб вылучэньстве папярэджвала, што, у сувязі з рацыяналізацыяй дзяржаўнага апарату, яго скарачэньнем, у некаторай частцы савецкіх устаноў, магчыма, будзе аказана супраціўленьне прыёму ў гэтыя апараты вылучэнцаў. Гэтае папярэджаньне апраўдалася на справе. Мы маем цэлы рад выпадкаў дрэнных адносін да вылучэнцаў і вылучэньства як на мясцох, так і ў цэнтры.

Наша задача заключаецца ў тым, каб шляхам шырокай і сьмелай крытыкі і самакрытыкі выкрыць і зьнішчыць усе недахопы, якія перашкаджаюць пармальнаму аздараўленьню дзяржаўнага апарату за кошт сталага, сыстэматычнага вылучэньня рабочых і сялян.

Агульным недахопам у вылучэньстве зьяўляецца **слабая плянавасьць** у гэтай справе. Вылучэньства ажыцьцяўляецца пераважна ў час перавыбарчай кампаніі, пры гэтым часта без належнай падрыхтоўкі. Нашы грамадзкія арганізацыі яшчэ мала займаюцца сыстэматычнай падрыхтоўкай кадроў для вылучэньня. Таму нягледзячы на факты **выпадковага вылучэньня** кандыдатур у саветы і нават у вышэйшыя выканаўчыя камітэты, што падрывае ў вачох працоўных мас самую ідэю вылучэньства.

Часта вылучэнцы, ўтрапіўшы на сталую працу, **сустракае фармальна-бюракратычныя адносіны** з боку тэхнічнага апарату і нават кіраўнікоў, асабліва ў першыя дні працы вылучэнца, калі яму патрэбна на кожным кроку таварыская дзелавая дапамога. Часта і ў далейшай працы кіраўнікі зусім ня цікавяцца работай вылучэнцаў. Апошнія-ж не заўсёды маюць сьмеласьць, каб свячасова зьвярнуцца да кіраўніка( які часта сам вельмі заняты справамі.

Падрыхтоўка вылучэнца для самастойнай працы **павінна быць важнейшай задачай** кіраўніка і ўсяго апарату ўстановы. Мы ведаем, што нашыя вылучэнцы—рабочыя ад варштату, бяднейшыя сяляне вёскі—малапісьменныя, але-ж ім трэба навучыцца працаваць, навучыцца кіраваць рознымі галінамі сацыялістычнага будаўніцтва. **Таму ўсю практыку, якая набыта намі за гады вялікага будаўніцтва, мы павінны перадаваць у штодзённай працы нашым вылучэнцам, нашай зьмене.**

Разам з гэтым трэба прыняць усе крокі да падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі шырокіх кадраў нізавых працаўнікоў саветаў і грамадзкіх арганізацый.

У гэтым годзе, па прыкладзе мінулага арганізуюцца цэнтральныя курсы жанчын—сталых працаўнікоў сельсаветаў, а таксама курсы працаўнікоў нізавых нацсаветаў. Гэтыя курсы трэба ўкамплектаваць, выходзячы з таго, што працаўнікоў сельсаветаў, якія павінны пасылацца на курсы, трэба рыхтаваць, як **вылучэнцаў, да сталай адказнай савецкай працы.** У часе апошняй перавыбарчай кампаніі працоўная жанчына заняла значнае месца ў саветах. У той час, калі ў мінулую кампанію было выбрана ў саветы жанчын—2.316 чал., зараз мы маем 9.832 жанчыны ў саветах. Сотні новых жанчын вылучаны на сталую працу ў саветах і выканкомах.

У складзе саветаў мы маем у два з паловай разы больш, чым у мінулую кампанію батракоў і сельгасрабочых, значна павысіўся процант беднаты ў саветах.

Сярод гэтай масы нашага савецкага актыву ёсьць шмат малапісьменных і вусім няпісьменных. Наша бліжэйшая і важнейшая задача **ліквідаваць няпісьменнасьць** сярод выбраных у саветы наогул і асабліва сярод жанчын, батракоў і беднаты.

Такім чынам, для таго, каб паленьшыць справу вылучэньства, каб найлепш скарыстаць вылучэнцаў, нам трэба: па першае, **больш плянавасьці** і рэгулярнасьці ў справе вылучэньства, **больш увагі** да яго, надаць вылучэнству масавы характар; падругое, дабіцца працмальнай **падрыхтоўкі вылучэнцаў** і, патрэцяе, трэба паладзіць (і не дапусьціць разрыву) **сыстэматычную сувязь вылучэнцаў з масамі,** шляхам выезду на месцы і рэгулярнай справаздачнасьці перад выбаршчыкамі.

**А. ХАЦКЕВІЧ.**

# Значэньне хэмізацыі ў рэканструкцыі народнай гаспадаркі

## (Да пяцігодкі хэмпрамысловасьці СССР)

Пяцігадовы плян народна-гаспадарчага будаўніцтва праходзіць пад знакам электрыфікацыі, мэталізацыі і хэмізацыі. У разьвіцьці хэміі і хэмізацыі краіны мы адсталі ад перадавых капіталістычных краін значна больш, чым у іншых галінах тэхнікі. Заняць перадавыя часьціі ў разьвіцьці хэмізацыі—вось чаго мы павінны дабіцца ў самы кароткі тэрмін. Што-ж праектуе пяцігадовы плян народнае гаспадаркі ў галіне хэмізацыі?

Што дае народнай гаспадарцы хэмізацыя?

Папершае, згодна пяцігодкі ў СССР пачнецца хэмічны выраб розных відаў сырцу і поўфабрыкатаў, што ўвозяцца зараз з-за граніцы і маюць вялікае значэньне для нашай краіны. Пакажам для прыкладу некаторыя з іх.

Збор бавоўны ў Саюзе не здавальняе тэкстыльнае прамысловасьці і нам на дзесяткі мільёнаў залатых рублёў прыходзіцца ўвозіць з заграніцы бавоўны Хэмія, шляхам вырабу штучнага валакна з драўніны, што расьце ў СССР у вялізнай колькасьці, дасьць мільёны рублёў для ўвозу маўны і на выпадак вайны значна забясьпечыць сырцом тэкстыльную прамысловасьць. Паводле пяцігодкі, прадукцыя штучнага валакна ўзрастае з 2 млн. да 135 млн. у 1932-33 годзе.

Наша ляка-фарбавальная прамысловасьць да гэтага часу для вырабу фарбаў ужывала ў вялікай колькасьці каляровыя мэталі: цынк, волава. Усю гэту колькасьць—13 тыс. тон—прыходзілася ўвозіць з заграніцы, затрачаючы да 4 млн. руб. валюты. Хэмія дае магчымасьць замяніць цынкавыя і валавыя бяліды літапонымі, а таксама тытанавымі; залежы сырцу для здабываньня апошніх у нас ёсьць.

Дзякуючы пераходу да вырабу літапонных бяліл замест валавых і цынкавых, лякафарбавальная прамысловасьць пры росьце ў 3,5 разы скарачае патрэбнасьць у каляровых мэталях з 13 тыс. тон да 7 тыс. тон, тым самым вызваляючы для індустрыялізацыі каля 1,5 млн. руб. валюты.

Хэмія знаходзіцца на шляху вырашэньня сырцовае праблемы і тлушчамылаварнай прамысловасьці. Ажыцьцяўленьне вытворчасьці штучных тлушчаў у шырокім маштабе дасьць 350 тыс. тон расьлённага алею для харчаваньня і дасьць магчымасьць для неабмежаванага разьвіцьця мылаварнае прамысловасьці.

Такім чынам, хэмія вызваляе і вызваліць важнейшыя галіны нашае прамысловасьці ад замежнае залежнасьці, закоўваючы пры гэтым мільёны рублёў валюты для індустрыялізацыі краіны.

Падругое, пяцігадовы плян прамысловасьці праектуе шляхам хэмічнае перапрацоўкі, скарыстаць адкіды вытворчасьці, што дагэтуль гінуць дарма. Так, для патраб Уральскае мэталюргіі штогод перапальваюць на драўніны вугаль мільёны куб мэтраў драўніны. Дагэтуль усе адкіды, што атрымлівалі пры апальваньні вугалю (воцтавая кіслата і мэтылявы сьпірытус), часта выпушчаліся ў паветра. Дзякуючы хэмізацыі апальваньня вугалю, да канца пяцігодкі будзе атрымана з адыходзячых газаў да 9.700 тон воцтавае кіслаты і каля 4.200 мэтылявага сьпірытусу.

Таксама, пры каксаваньні каменнага вугалю ёсьць адкіды—газы, якія яшчэ ня так даўно выпушчаліся ў паветра. Хэмізацыя каксавальнае вытворчасьці, якая будзе праведзена ў пяцігодцы, дасьць магчымасьць да 32-33 г. атрымаць рад прадуктаў, якія зьяўляюцца вельмі каштоўным сырцом для вырабу тукаў, анілінавых фарбаў і г. д. Пры вытворчасьці сьпірытусу атрымліваецца тапны від адкіду—сівушнае масла, якое дагэтуль вывозіцца амаль дармова за граніцу. Хэмія дасьць магчымасьць выпрабляць з яго дарагія эфіры, патрэбныя для нашае парфумэрнае прамысловасьці.

Зараз мы перажываем значны голад у серкавай кіслаце. Ня гледзячы на гэта, наша каляровая мэталюргія выпушчае сотні тысяч тон серкавае кіслаты ў паветра, у выглядзе газу, прычым, з перапрацоўваемага калчадану мы скарыстоўваем толькі 3-5 проц. (медзь), рэшта выкідаецца. Да канца пяцігодкі наша прамысловасьць, дзякуючы хэміі, будзе мець усе 35-40 проц. серкі, што знаходзіцца ў калчадане. Апрача таго, будзе скарыстана таксама жалеза, што ёсьць у калчадане. Такім чынам, да канца пяцігодкі замест 3-5 проц. хэмія дасьць магчымасьць скарыстаць 75-80 проц. калчадану.

Да гэтага часу шлак, што атрымліваецца пры вытворчасьці жалеза, лічыўся няпрыемным адкідам. Хэмія знайшла магчымасьць скарыстаць шлак пры перапрацоўцы руды, якая мае фосфар у крыху зьмененым выглядзе, як мінэральнае ўгнаеньне (тамаснлак), а таксама для вырабу будаўнічых матар'ялаў, па пяцігодцы да 32-33 г. будзе вырабленна каля 100 тыс. тон тамаснлаку. Увядзеньне хэмічных мэтадаў у мэталюргічную і машынабудаўнічую прамысловасьць (аўтагэнная зварка, вытворчасьць храмаванае сталі і г. д.) у вялізнай меры паленьшыць якасьць машын і жалезных вырабаў і павялічыць іх існаваньне прыкладна на 20-30 проц.

Яшчэ большае значэньне набывае хэмізацыя сельскае гаспадаркі, якая зьяўляецца адным з сродкаў ясь сацыялістычнага ператварэньня. Хэмізацыя сельскае гаспадаркі дае магчымасьць значна павысіць ураджайнасьць. Да канца пяцігодкі хэмія дасьць сельскай гаспадарцы 8,5 млн. тон мінэральных угнаеньняў. Гэта колькасьць угнаеньняў, па падліках інстытуту мінэральных угнаеньняў, забясьпечвае наступны прырост ураджаю: па ільне—1 млн. тон, коштам 65 млн. руб., па буракох—3,5 млн. тон, коштам 45 млн. руб., па бавоўне—0,5 млн. тон, коштам 135 млн. руб., па бульбе—3 млн. тон, коштам у 170 млн. руб. і па кораньплодах і кармовых травах—на 90 млн. руб. (цэны Дзяржпляну на 32-33 г.). Усяго прырост ураджаю ў пераводзе на грошы складае 550 млн. руб., а ў пераводзе на збожжа—10 млн. тон. Апрача таго, хэмічная барацьба са шкодніками сельскае гаспадаркі (саранча, галіўня, мышы, сусьлікі і г. д.) дасьць дадаткова 5 млн. тон збожжа.

Паданыя факты гавораць, што хэмізацыя народнае гаспадаркі СССР установіць цэлы рад новых вытворчасьцяй для СССР, налегчыць сырцовае пытаньне для многіх важнейшых галін прамысловасьці, аслабіць іх залежнасьць ад капіталістычных краін, забясьпечыць больш поўнае скарыстаньне сырцу, будзе дапамагаць уздыму і рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Але задача хэмізацыі СССР патрабуе ўзмоцненага разьвіцьця савецкай хэмічнай прамысловасьці—гэтага фундаманту хэмізацыі СССР. Пры агульным росьце ўсяе прамысловае вытворчасьці ў два з паловаю разы, валавая прадукцыя хэмічнае прамысловасьці ўзрасьце паводле пяцігадовага пляну ў тры з паловаю разы, выпярэджваючы шпаркасьцю свайго росту ўсю цяжкую індустрыю.

Пяцігадовы плян намячае буйнейшы структурны зрух унутры хэмічнае прамысловасьці, найбольш шпаркае і інтэнсыўнае разьвіцьцё «цяжкое хэміі», якая стварае сродкі вытворчасьці для прамысловае і сельска-гаспадарчае вытворчасьці і забясьпечвае абароназдольнасьць краіны. Так, пры агульным росьце ўсяе хэміі ў 3,5 раз, цяжкая хэмія вырасьце ў 4,5 раз (ад 250 м. р. валавое прадукцыі ў 1927-28 г. да 1.160 м. р. у 1932-33 г.), дзлёка выпярэджваючы ў сваім разьвіцьці ўсе без выключэньня галіны прамысловасьці, у тым ліку і машына будаўніцтва і выраб будаўнічых матар'ялаў.

Другі структурны зрух, які робіць хэмічная пяцігодка, гэта ператварэньне аснэўнай хэміі, якая гістарычна ўзьнікла, як дапаможная галіна для тэкстыльнае прамысловасьці, у галіну, што вырабляе мінэральныя ўгнаеньні, у галіну, якая непасрэдна злучае сацыялістычную індустрыю з вёскаю. Так, замест 250.000 тон угнаеньняў, выраблянных хэміяй у 1913 г., савецкая хэмія вырабіць 360 тыс. тон у 1928-29 г. і 8.500 тыс. тон у 1932-33 г. Як мы бачым, даваенны прыкладна ў 35 раз, а ўзровень 1928-29—у 23 разы.

Усе адзначаныя вышэй структурныя зрухі забясьпечваюцца адноўленьнем тэмпам аднаўленьня асноўнага капіталу хэмічнае прамысловасьці. Усяго за пяць год мяркуецца ўлажыць у хэмію 1.250 мільёнаў рублёў, або 8,2 ўсіх укладаньняў у прамысловасьць.

Роля новых заводаў у выпуску прадукцыі ўзрастае за пяць год у шэсьць раз: з 9-10 проц. у 1927-28 г. да 56-60 проц. да канца пяцігодкі. Праграма хэмічнага будаўніцтва ў асноўным базуецца на будаўніцтве гіганцкіх камбінатаў, арганічна ўвязаных з усёй сыстэмай электрабудаваньняў і мэталюргічных цэнтраў краіны. Вытворчы маштаб гэтых прадпрыемстваў надзвычайна значны, набліжаючыся да маштабаў буйнейшых хэмічных заводаў Нямеччыны і Амэрыкі. Так, цэнтральны камбінат запраектаваны па 1 міл. тон угнаеньняў, Уральскі—на 700 тыс. тон, Дняпроўскі—на 400 тыс. тон і г. д. Кошт паасобных камбінатаў дасягае 70-100 міл. руб.

На росьце прадукцыйнасьці працы хэмічная прамысловасьць высоўнаецца на першае месца ва ўсёй прамысловасьці. Так, прадукцыйнасьць працы ва ўсёй прамысловасьці ўзрастае за пяць год на 95 проц., а па хэміі ад 128 да 265 проц. (па асобных галінах хэміі). Сабекошт хэмпрадуктаў зьніжаецца да канца пяцігодкі на 40 проц., тым самым падходзячы да сабекошту хэмікалія за граніцай.

Трэба яшчэ адзначыць, што выдаткі на навукова-дасьледчыя работы, лябараторыі, навуковыя інстытуты і г. д. у суме 40 міл. руб. за пяць год падводзяць шырокую матар'яльную базу пад навукова - дасьледчую работу хэмічнае прамысловасьці і стваракоць шырокую сетку дасьледчых устаноў, якія ахапляюць усю прамысловасьць зьверху да нізу.

Вялікая хэмічная пяцігодка зьяўляецца пяцігодкай напружанай, выканаць якую можна толькі пры ўмове, калі пытаньні разьвіцьця хэміі, пытаньні хэмізацыі СССР будуць стаяць у цэнтры ўвагі ўсіх гаспадарчых, грамадзкіх, рабочых, партыйных і навуковых арганізацый нашае краіны.

**П. З.**

---

29-га чэрвеня, у 10 гадзін раніцы, згодна пастановы ЦК КП(б)Б

*Склікаецца нарада загадчыкаў аддзелаў*

### АК КП(б)Б ПА ПРАЦЫ НА ВЁСЦЫ

Пытаньня, якія будзе вырашаць нарада:

*1. Аб задачах аддзелаў па працы на вёсцы.*

*2. Аб выніках гаспадарчай дапамогі беднаце і аб працы партыі сярод беднаты.*

*3. Аб становішчы сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі і мерапрыемствах па іх узмацненьню.*

Ад акруг апрача загалчыкаў вясковымі аддзеламі АК трэба камандыраваць: ад Бабруйскай, Аршанскай, Магілёўскай, Полацкай і Мазырскай па адным сакратару РК КП(б)Б і адным сакратару вясковых ячэек, ад Менскай акругі адзін сакратар вясковай ячэйкі.

---

# ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

# Да праверкі ячэйкі слаба рыхтаваліся

## З ПАРТЯЧЭЙКІ ВСНГ НА ПРАВЕРАЧНЫ СХОД ЗЬЯВІЛІСЯ ТОЛЬКІ ДВОЕ КАМУНІСТЫХ

### Прыклад добрай падрыхтоўкі да чысткі дае парткалектыў заводу „Камунар"

**Сакратаром ячэек ВСНГБ і Камвузу дана суровая вымова за дрэнную падрыхтоўку да чысткі і няяўку на праверачны сход**

На сходзе ў абавязковым парадку павінны былі прысутнічаць партячэйкі ВСНГБ, Наркампрацы, Белпэдтэхнікуму і парткалектыву заводу «Камунар» і камуністычнага унівэрсытэту.

Толькі па «Камунары» і ў камуністычным унівэрсытэце налічваецца каля 500 камуністых. І калі да гэтай лічбы далучыць яшчэ членаў партячэйкі ВСНГБ, Наркампрацы і пэдтэхнікуму, дык мы маем досыць вялікую колькасьць.

— На сходзе павінна было прысутнічаць каля тысячы чалавек. Аднак, усе гэтыя меркаваньні аказаліся даромнымі. На сход зьявіліся акуратна толькі камуністыя і беспартыйныя рабочыя **заводу «Камунар», а з іншых ячэек вялікая колькасьць таварышоў ня прышла.** Сход пачаўся са спазьненьнем амаль на паўтары гадзіны.

* * *

Пачалі праверку. Адзін за другім правяраюцца таварышы, вызначаныя ў праверачныя камісіі. Няма з боку прысутных дробязных прыдзірак, беспадстаўных выступленьняў. Прысутныя поўнасьцю ўсьвядомілі палітычныя задачы праверкі. Кожнаму таварышу давалася аднаведная пэўная ацэнка.

* * *

Праверку праходзіць тав. **Заянчкоўскі.** Ён коратка бяз лішніх слоў апавядае пра сваё жыцьцё і работу. Тав. Заянчкоўскі—сьлесар, працуе на заводзе **«Камунар».** У партыі—з 1919 году. Працуючы ля варштату, прымаў актыўны ўдзел у рабоце парткалектыву, Мен. АКК і Фрунзаўскага райкому КП(б)Б. Зараз тов. Заянчкоўскі—член раённага камітэту партыі.

Потым тав. **Захарава.** Яе жыцьцяпіс—гэта доўгія гады працы на вытворчасьці. Яна з малых год пайшла працаваць краўчыхай. Першы час працавала ў саматужных кравецкіх майстэрнях, потым на фабрыцы. Зараз вылучэнка, намесьнік народнага камісара працы. Член партыі з 1919 году.

У тав. Захаравай пытаюць пра яе работу ў наркамаце, пра работу ў ячэйцы і г. д.

Ці можна тав. Захараву пакінуць у складзе праверачнай камісіі?

Так, можна,—адказвае сход.

* * *

У канцы сходу праверачная камісія падлічыла лік партыйцаў, што не зьявіліся на сход. Вынікі падліку паказваюць аб тым, што ў ячэйках слаба правялі падрыхтоўку. Камісія высьветліла, што на сходзе прысутнічае толькі адзін камуністы з усяго калектыву камуністычнага унівэрсытэту. Гэта ў той час, калі на сход павінны былі зьявіцца 200 партыйцаў, членаў калектыву. **Нават, сакратар парткалектыву не зьявіўся на сход.**

З ячэйкі ВСНГБ на сход прышлі толькі два партыйцы, прычым сакратар гэтай ячэйкі таксама не зьявіўся на сход.

Камісія не магла не рэагаваць на такое абураючае зьявішча. Камісія ў зьвязку з гэтым прыняла пастанову, у якой абвясьціла **суровую вымову сакратару ячэйкі КП(б)Б ВСНГБ і сакратару парткалектыву камуністычнага унівэрсытэту.**

**Г.Т.**

# Масавую работу паставіць у цэнтр увагі

**(Ячэйка КП(б)Б, ф-кі «Чырвоны Настрычнік», Мазыр)**

Перавыбары бюро ў нашай ячэйцы прайшлі пад знакам шырока разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі ўсіх галін работы і кіраўніцтва ячэйкі. Перавыбарчы сход асноўную ўвагу накіраваў на праверку таго, як ячэйка спраўлялася з гаспадарчай работай, з работай па ўздыме прадпрыемства. Як выявілася, ячэйка слаба зварачала ўвагу на зьніжэньне сабекошту. Сабекошт прадукцыі зьніжаны толькі на 4 проц., а ў чакавіку наглядалася нават павялічэньне выдаткаваньня альбуміну на кубаметр фанэры каля 4 кгр. Прычына гэтаму: наўважлівыя адносіны адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу, саміх клейшчыц да работы.

Бюро ячэйкі за справаздачны пэрыяд праявіло значную работу. Свячасова былі прапрацаваны асноўныя пастановы партыі, і ячэйка дала жорсткі адпор праваму ўхілу і прымірэнцтву. У галіне вытворчасьці, дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву з боку ячэйкі, ёсьць некаторыя дасягненьні: павялічыўся выхад прадукцыі на 36,85 проц., прадукцыйнасьць працы ўзьнята на 14 проц., што пры ўмовах надта дрэннага старога абсталяваньня нашай фабрыкі—вялікі посьпех. Але побач з гэтым трэба падкрэсьліць і некаторыя ненармальнасьці. Побач з ростам выпуску прадукцыі наогул на 36,85 проц. наглядаецца зьніжэньне выпуску экспартнай фанэры 1-га гатунку на 4-5 проц. Гэта тлумачыцца тым, што слаба зьвернута ўвага на скарыстаньне сырцу (касая рэзка калод, дрэнная рубка шпон і інш.).

Слаба вялася культурна-выхаваўчая праца сярод рабочых. Фракцыя заўкому не зварачала ўвагі на працу часовай кантрольнай камісіі, якая працавала некалькі тыдняў. Камісія працавала адарванай ад мас і потым вынікі яе работы апынуліся ў архівах.

Усе гэтыя пытаньні давялі падкрэсьлілі на сходзе ў далейшых прапановах новаму складу бюро.

Вынікі дрэннай культурна-масавай работы ячэйкі відавочны. Ня гледзячы на тое, што на фабрыцы працуе каля 400 чал. рабочых, за 6 мес. прыняты ў партыю толькі 2 чал.

Новы склад бюро выбраны бяз ухіла ад папярэдняга намячэньня кандыдатур, склад яго абноўлены на 50 проц.

Новаму бюро агульны сход прапанаваў зьвярнуць асаблівую ўвагу на якасьць і патаньне капітальнага будаўніцтва, а таксама на большую актыўнасьць камуністых у правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва, бо ёсьць асобныя камуністыя, якія не разумеюць усёй важнасьці гэтай справы.

Новаму складу бюро ячэйкі трэба ўсе тыя недахопы, якія выяўлены на сходзе, мець на ўвазе і ў сваёй далейшай рабоце іх зьнішчыць.

Сакратаром ячэйкі на першым пасяджэньні бюро выбраны член партыі з 1919 г., перадавы таварыш.

**МУРАВЕЙКА.**

# Не замазваць пытаньняў, якімі цікавіцца маса

**(Парткалектыў фабрыкі „Прафінтэрн", Віцебск)**

Актыўнасьць партыйных мас, выключная дзелавітасьць, шырока разгарнутая самакрытыка—вось асаблівасьці перавыбараў бюро парткалектыву «Прафінтэрн». Партыйная маса крытыкавала ня толькі асобныя моманты работы бюро, выступаўшыя падкрэсьлівалі і тое, што бюро ў справаздачным сваім дакладзе не завастрыла асобных моментаў, якімі жыве партыйная маса і ўся фабрыка. У дадатак да гэтага даклад ні быў наперад прапрацаваны на пасяджэньні бюро калектыву.

У радзе выступленьняў паказвалася на тое, што ва ўзаемаадносінах «трыкутніка» было рад недарэчнасьцяй: старшыня фабкому падмяняў часамі адміністратара, апошні праяўляў спробы кіраваць абсалютна ўсім, ня лічачыся з партыйнай і рабочай масай. Як першае, так і другое зьяўляецца вынікам дрэннага разуменьня партыйных дырэктыў аб працоўнай дысцыпліне і мэтадаў кіраваньня прадпрыемствам. Як факт, можна падаць прызначэньне інструктараў без вылучэньня цэхавымі вытворчымі нарадамі; роспуск аднаго з цэхаў без папярэдняга паведамленьня фабкому і рабочых гэтага цэху.

Як-жа на ўсё гэта рэагавала бюро парткалектыву?

Толькі ў апошні час на зачыненых пасяджэньнях бюро сталі гаварыць аб гэтым, баючыся выносіць гэта на абгаварэньне партыйнай масы. Таму правільна зазначалі ў спрэчках, што бюро і ў прыватнасьці сакратар калектыву не ажыцьцяўлялі цьвёрдага кіраўніцтва, свячасова ня выносілі надзённых пытаньняў на абмеркаваньня мас.

Такія пытаньні, як падрыхтоўка да чысткі партыі, рост за лік рабочых, зусім адсутнічаюць у справаздачы бюро. На фабрыцы працуе 44 проц. жанчын, а праца сярод іх вядзецца кепска, нават былі спробы выцісканьня жаночай працы з прадпрыемства.

За справаздачны пэрыяд цэх'ячэйкі узмацніліся, правільней—у барацьбе з бюро калектыву яны адваявалі свае правы на існаваньне дзякуючы ініцыятыве нізавога ячэйкавага актыву. Справа вылучэньня праводзілася не ў аднаведнасьці з дырэктывамі партыі. Вылучэньне адбываецца так: Маецца сьпіс таварышоў на вылучэньне з мінулага году, а ніякай падрыхтоўкі з таварышамі не праводзіцца, калі-ж райкомы звоняць «дай чалавека на вылучэньне», то даюць таварыша ў любы час, нават не перагаварыўшы з вылучэнцам аб яго будучай рабоце.

Партасьвета праводзілась кепска, у значнай меры па віне самых партыйцаў, якія нерагулярна і ў рабочай наведвалі школы. Асабліва недапушчальныя адносіны самога кіруючага актыву да партучобы, дзякуючы чаму ён адстае ад масы і часта не разьбіраецца ў складаных пытаньнях, якія сустракаюцца ў рабоце. Большая доля віны падае за гэта на апа-работніка, які ня сур'ёзна адносіўся да сваёй работы.

У працы калектыву ёсьць, вядома, і буйныя посьпехі, аб якіх тут я не зазначаю. Але трэба сказаць, што калі-б не актыўнасьць радавой масы калектыву, якая часта папраўляла памылкі і слабыя бакі работы бюро калектыву, то апошні ня справіўся-б са сваёй работай.

Аднак, ня гледзячы на ўсё гэта у новае бюро папала большасьць таварышоў з старога складу. Гэтыя вынікі супярэчаць усяму характару сходу, ня гледзячы на абсалютную дэмакратыю, пры якой праходзілі выбары. Гэта гаворыць за недастатковую рашучасьць большай часткі партыйцаў вылучаць новыя сьвежыя сілы на кіруючую работу.

**Л. Шастак.**

# Не ўхапіліся за галоўнае

## Некалькі момантаў з работы Лельчыцкай райпартарганізацыі

**(Мазырская акр.)**

Лельчыцкай райпартарганізацыі прыходзіцца працаваць у больш цяжкіх умовах у параўнаньні з іншымі райпартарганізацыямі, бо гэты раён больш адсталы, чымся другія, у культурных адносінах і знаходзіцца на досыць вялікай адлегласьці ад чыгункі. Таму адказнасьць за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі, за правядзеньне клясавай лініі ва ўсіх галінах работы ў кожнага партыйца павінна быць большая. На жаль у практычнай працы арганізацыі прыходзіцца адзначыць цэлы рад грубых памылак і недахопаў—паказчыкаў гэтай безадказнасьці.

Як ва ўмовах Лельчыцкага раёну ажыцьцёўлены пастановы XV партзьезду і пленуму ЦК у адносінах разьвіцьця сельскай гаспадаркі? Некалькі лічбаў аб разьвіцьці сельскай гаспадаркі ў раёне выразна выяўляюць гэта становішча. Усяго ў раёне налічваецца 4 калгасы (з лікам 25 членаў), розных іншых сель.-гаспадарчых аб'яднаньняў 9—з 324 членамі. У раёне 13.733 дзесяціны зямлі або 45 проц. усёй пахаці, знаходзіцца пад пералогамі, у вёсцы усё больш узрастае драбленьне гаспадарак: у 1925 г. налічвалася 4.727 гаспадарак, а ў 28 годзе—5.284.

Пры наліччы наяўнасьці пабочных заработкаў мажліва было гэтыя сродкі, атрыманыя ад гэтага, мабілізаваць на ўзмацненьне сельскай гаспадаркі, на яе інтэнсыфікацыю. На жаль, партарганізацыя на гэта не зьвярнула сур'ёзнай увагі, а наадварот некаторая частка партыйцаў лічыць аснoўнай перашкодай у разьвіцьці сельскай гаспадаркі наліччa гэтых заработкаў.

Для перамаганьня тых цяжкасьцей, якія стаяць на шляху ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі, для стварэньня аднаведнага пералому і зруху з таго цяжкога становішча, у якім знаходзіцца сельская гаспадарка раёну, патрэбна было партарганізацыі мабілізаваць увагу ўсіх устаноў і арганізацый (сельсаветы, каапэрацыю, КСУ) для выкананьня гэтых задач. У практычнай-жа рабоце гэтага няма.

**Сель.-гаспадарчая крэдытная каапэрацыя** яшчэ надта слаба пусьціла свае карэньні ў масы сялянства (абхоп сялянскіх гаспадарак сельгаспадарчай каапэрацыяй складае ўсяго 25,9 проц.). Сацыяльны склад членаў каапэрацыі нявыстарчальна рэгулюецца (сярод іх шмат заможных). У рабоце с-г. каапэрацыі выяўлены рад выпадкаў скрыўленьня клясавай лініі. Так, па **Буйнавіцкім** сель.-гаспадарчым таварыстве атрымалі крэдыты з фондаў беднаты середнякі. Старшыня таварыства-камуністы выдаў крэдыт на куплю каня дзяку у той час, калі заяўкі беднаты на крэдыт не задаволены.

**Сельсаветы і камітэты сялянскай узаемадапамогі** ў сваёй практычнай працы зусім слаба адбіваюць задачы ўзьнікшага сельскай гаспадаркі, арганізацыі беднаты і аказаньня ёй дапамогі.

Ужо з паданых вышэй даных можна зрабіць такі вывад, што партыйная арганізацыя слаба займалася практычным праламленьнем дырэктыў партыі ў галіне эканамічнага ўздыму, росту і правільнага накіраваньня разьвіцьця гаспадаркі.

### ПРАФСАЮЗЫ БЕЗ КІРАЎНІЦТВА

Некалькі слоў аб рабоце прафсаюзаў, іх ролі ў агульным жыцьці раёну. Дырэктывы партыі аб тым, што прафсаюзы на вёсцы павінны быць сапраўднымі застрэльшчыкамі па сацыялістычнай перабудове вёскі не знайшлі адбітку ў рабоце прафсаюзаў. Нічога ня зроблена па лініі выхаваньня прафсаюзных мас і адсюль атрымаўся рад ненармальных зьяў як, рвацтва, кіданьне работы ў часы сяўбы (а кіравалі ўсім гэтым былыя паліцэйскія і кулакі). Наглядаецца засьмечанасьць саюзаў чужымі элемэнтамі: з 77 членаў саюзу саўгандальслужачых 22—непрацоўнага пахаджэньня, прычым амаль, што ўсе былыя гандляры, прычыніўшы свае крамы, пралезьлі на работу ў каапэрацыю. Трэба адзначыць, што, пачынаючы з райкому і канчаючы ячэйкамі КП(б)Б, ніхто не зьвярнуў належнай увагі на кіраўніцтва праф. работай.

### ПАПАЎНЯЮЦЬ СВАЕ РАДЫ ЛЕПШЫМІ БАТРАКАМІ

Правадзімая гаспадарчая работа ў раёне не магла не адбіцца на росьце партыйнай арганізацыі за лік батрацкай і лепшай бяднацкай часткі вёскі. Арганізацыя за год **узрасла ўсяго на 18 чалавек.** Галоўным недахопам у працы партарганізацыі зьяўляецца слабась

# Сацыялістычнае спаборніцтва ў Чырвонай Арміі

## Сацыялістычны дагавор чырвонаармейцаў з рабочымі

### (№-скі полк Ворша)

На палкавые сходы чырвонаармейцаў ваенком палка тав. Бабкоў дакладваў:

— Мы павінны, па прыкладзе рабочых, якія па сваёй уласнай ініцыятыве заключаюць дагаворы на ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы, на патаннешае прадукцыі, паляпшэньне яе якасьці, таксама абвязьцьць спаборніцтвы на лепшую вайсковую падрыхтоўку, на добрыя посьпехі ў вайсковай і палітычнай вучобе. Толькі дзякуючы напружанай рабоце на ўсіх вучастках нашага будаўніцтва, мы будзем пасоўвацца наперад, пасьпяхова ажыцьцяўляць пяцігадовы плян народнай гаспадаркі.

Узьняцьцем тысячы рук полк пастанавіў уступіць у сацыялістычнае спаборніцтва, дабіваючыся па ўсіх галінах вучобы адзнакі «добра», і выклікаць Н-скі полк і завод «Чырвоны Кастрычнік».

Тут-жа выбраецца дэлеганыя з 50-ці чырвонаармейцаў для пасылкі на завод «Чырвоны Кастрычнік».

Калі чырвонаармейцы прышлі на завод, гукі звону сабралі шмат народу. Адкрыўся рабочы сход. Чырвонаармеец Садоўскі, узяўшы першае слова, растлумачыў значэньне выкліку рабочых заводу на сацыялістычнае спаборніцтва.

— Мы будзем узмацняць вайсковую справу, а вы ўздымайце прадукцыйнасьць працы, узмацняйце сацыялістычную гаспадарку.

Тут-жа быў афармлены сацыялістычны дагавор.

На 17 проц. узьняць прадукцыйнасьць працы, на 7 проц. зьнізіць сабекошт прадукцыі і на 3 проц. зьнізіць расцэнкі на зьдзельшчыне. Адзін за другім узыходзілі рабочыя на трыбуну і падпісвалі дагавор.

Позна ноччу рабочыя праводзілі дэлегацыю чырвонаармейцаў. У наступны тыдзень рабочыя абяцалі прыйсьці ў лягеры, азнаёміцца з жыцьцём палка.

Так мацнее дзелавая сувязь рабочых з Чырвонай арміяй.

## Падпісаны дагавор з № палком

### (№ полк Беларускай дывізіі)

Разгарнутае сацыялістычнае спаборніцтва рабочае клясы знайшло адбітак у жыцьці і працы Чырвонае арміі.

Спаборніцтва ў нашым палку ахапіла наступныя галіны жыцьця і вучобы: палітычную работу, страляковую, стрявую падрыхтоўку, вайсковую дысцыпліну і ўнутраны распарадак.

Наш полк заключыў дагавор з N-скім страляковым палком.

Задачы, якія пастаўлены перад намі, наступныя:

Па палітычнай падрыхтоўцы вывучыць пяцігодку і папулярызаваць яе праз лісты на вёску, прайсьці летнюю палітпраграму з ацэнкай «добра» на 40 проц., «здавальняючы» на 60 проц., дабіцца зразуменьня ўсімі байцамі інтэрнацыянальнага значэньня Чырвонай арміі.

З ліку звальняемых у гэтым годзе падрыхтаваць 150 актыўных працаўнікоў для вёскі і навербаваць 100 чалавек у калгасы. Па палітычна стрявой падрыхтоўцы чырвонаармейцы другога году службы к канцу летняй вучобы павінны быць падрыхтаваны на годнасьці інструктара.

«На палявых тактычных заняткох уважліва адносіцца да маемасьці (пасеваў) насельніцтва».

Дабіцца цьвёрдай і сьвядомай дысцыпліны, як галоўнай асновы баяздольнасьці часьці.

Перад ваенкорам пастаўлена задача—правяраць заключаную ўмову.

Умова была дасканала прапрацавана на сходах чырвонаармейцаў нашага палка. Выбраная дэлегацыя езьдзіла ў N. полк, дзе, азнаёміўшыся з яго становішчам, падпісала дагавор.

А. КЛЮТКО.

# ПРЫЗЫЎ І ЗВАЛЬНЕНЬНЕ-ВАЖНЕЙШЫЯ КАМПАНІІ Ў ЖЫЦЬЦІ РСЧА

Кампанія прызыву і звальненьня з Чырвонай арміі—важнейшая з усіх штогодных кампаній—праходзіць у нас найбольш арганізавана і з найбольшым посьпехам. Кожны год мы ў гэтай справе маем ўсё новыя і новыя дасягненьні. Гэта, натуральна, таму, што ні адна армія ня мае такіх прадпасылак да здаровага, парнальнага прыцягненьня ў свае рады працоўнай моладзі, якія мае наша рабоча-сялянская Чырвоная армія. Пэрыяд прызыву абарачаецца ва многіх мясцох нашага Саюзу ў ваеннае сьвята, прычым гэты пэрыяд зьяўляецца найлепшым момантам для агітацыі і прапаганды ідэй абароны Савецкага Саюзу. Вось чаму прызыву павінны падлягаць усе працоўныя прызыўнога ўзросту незалежна ад тэй колькасьці, якая фактычна патрэбна для папаўненьня штатных радоў арміі. Няхай галоўная маса будзе распускацца па хатах і праходзіць ваеннае навучаньне на завайсковым парадкам, але яна павінна быць захоплена жаданьнем таць у рады Чырвонай арміі.

Гэты момант усьведамляецца ў сучасны момант ня толькі працоўнымі масамі асноўных груп насельніцтва Саюзу, але і нацыянальнымі меншасьцямі. Рад народнасьцей настойліва дамагаецца на ўсіх канфэрэнцыях і вясдах распаўсюджаньня на іх агульнага закону аб абавязковай вайсковай службе.

Прыходзіцца з вялікай цяжкасьцю ім даводзіць, што мала аднаго рашэньня іх прыцягнуць на сапраўдную вайсковую службу. Патрэбны падрыхтоўчыя мерапрыемствы—падрыхтаваць грамадзкую думку, правесьці дапрызыўную падрыхтоўку, стварыць нацыянальны кавалерыйны склад.

Прызыў гэтага году павінен прайсьці яшчэ больш арганізавана, чым у мінулыя гады, бо гэтымі днямі наркамваенмор зацьвердзіў новае палажэньне аб чарговых прызывах, якое ўводзіцца на замену ранейшага палажэньня, выданага ў 1926 годзе. Асабліва сьці гэтага палажэньня наступныя: перш за ўсё яно знаходзіцца ў поўнай адпаведнасьці з новай рэдакцыяй закону аб абавязковай вайсковай службе; затым яно ўводзіць спрошчаную картавую сыстэму дзеловодзтва прызыўных камісій, што скарачае да мінімуму час прабываньня прызыўніка на зборных пунктах. Новае палажэньне рэзка скарачае справаздачнасьць па прызыве. Яно мае толькі 8 розных форм для справаздачнасьці, замест 28, прадуглежаных старым палажэньнем. Нарэшце, палажэньнем значна палегчаны і абавязкі самога насельніцтва у зьвязку з прызывам. Так, напрыклад, прадастаўленьне ільгот без падачы заяў, вызначэньне непрацаздольнасьці сельскага насельніцтва вучастковымі дактарамі, а не ў паявтовых доктарскіх камісіях і г. д.

Усіх аднагоднікаў, што прайшлі вышэйшую дапрызыўную падрыхтоўку, звычайна прызывалі ў першых лічбах новага году. Зараз яны будуць прызывацца адначасова з усімі—увосень, у пэрыяд чарговых прызываў але ў войска іх будуць накіроўвацца пазьней. У морскі і паветраны флёт аднагоднікі будуць накіроўвацца ў кастрычніку - лістападзе, а іншыя часьці войск—у лютым.

Прымаецца, як у мінулым годзе, рад мер, каб у армію не трапляў клясава чужы элемент. У гэтым годзе рэвваенсаветам округ дана права праводзіць прызыў бяз жараб'ёўкі ня толькі ў раёнах камплектаваньня тэрытарыяльных войск, але і там, дзе камплектуюцца кадры.

Звальненьне ў гэтым годзе будзе праводзіцца прыкладна ў тыя-ж тэрміны, як і ў мінулым годзе, у парадку чарговасьці, у залежнасьці ад умоў службы таго або іншага роду войск.

Калі чырвонаармейцы прышлі на завод, гукі звону сабралі шмат народу. Адкрыўся рабочы сход. Чырвонаармеец Садоўскі, узяўшы першае слова, растлумачыў значэньне выкліку рабочых заводу на сацыялістычнае спаборніцтва.

— Мы будзем узмацняць вайсковую справу, а вы ўздымайце прадукцыйнасьць працы, узмацняйце сацыялістычную гаспадарку.

Тут-жа быў афармлены сацыялістычны дагавор.

На 17 проц. узьняць прадукцыйнасьць працы, на 7 проц. зьнізіць сабекошт прадукцыі і на 3 проц. зьнізіць расцэнкі на зьдзельшчыне. Адзін за другім узыходзілі рабочыя на трыбуну і падпісвалі дагавор.

Позна ноччу рабочыя праводзілі дэлегацыю чырвонаармейцаў. У наступны тыдзень рабочыя абяцалі прыйсьці ў лягеры, азнаёміцца з жыцьцём палка.

Так мацнее дзелавая сувязь рабочых з Чырвонай арміяй.

## САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

# ГАНЯЮЧЫСЯ ЗА КОЛЬКАСЬЦЮ НЕ ЗАБЫВАЦЬ ПРА ЯКАСЬЦЬ

## ЯШЧЭ РАЗ: МЕНШ ГУЧНЫХ СЛОЎ, БОЛЬШ КАНКРЭТНАЙ СПРАВЫ

### ПЕРШЫ МЕСЯЦ СПАБОРНІЦТВА

#### (Менскі мэханічны хлебазавод)

Падрыхтоўчая работа да спаборніцтва пачалася ў красавіку. Пытаньне распрацоўвалася на ячэйцы, у заўкоме, вытворчай камісіі і, нарэшце, на шырокай вытворчай нарадзе. 1-га мая па вечары рабочыя ўрачыста прынялі выклік рабочых магілеўскага хлебазаводу.

ЦП саюзу харчавікоў пасьля таго, як работа па спаборніцтве пачалася, пасьпяшылася прыслаць вялікі цыркуляр, у якім ЦП прапануе (!) уступіць у спаборніцтва (?).

Быў выдзелены штаб кіраўніцтва, які пачаў працаваць праз вытворчую нараду. У выніку выявілася, што штаб не патрэбен, апошні сам сабой разваліўся і ўся работа перайшла да вытворчай камісіі.

Было праведзена некалькі нарад: тэхнічная, кваліфікаваных рабочых, рабочых цукерні, барапачнага цэху і ўсіх брыгад булачнікаў і хлебпікаў, на якіх абгаворваліся пытаньні спаборніцтва, якасьці прадукцыі, глуму, працоўнай дысцыпліны і г. д.

Сацыялістычным спаборніцтвам ахоплены ўсе рабочыя заводу і цукерні. Гэтага ўдалося дабіцца шляхам цэхавых і індывідуальных выклікаў праз насьценгазэту і спэцыяльнымі плякатамі, якія вывешваліся на заводзе.

За месяц выпушчаны два спэцыяльныя нумары насьценнай газэты, прысьвечаныя спаборніцтву.

Выпадкаў парушэньня працоўнай дысцыпліны за час спаборніцтва—значна менш. Прагулы і спазьненьні на работу за апошнія два тыдні зусім зжыты. Большасьць рабочых зразумела задачы спаборніцтва. Гэта відаць з выступленьняў на сходах і па рабоце.

Самае балючае пытаньне—гэта якасьць прадукцыі. Рабочыя ў парадку самакрытыкі пацьвярджаюць, што прэса правільна б'е трывогу з поваду нядобраякаснага хлеба і калача. Гэтымі днямі была склікана нарада ўсёй кваліфікаванай сілы заводу. Разглядалася пытаньне аб якасьці хлеба. Дырэктар заводу тав. Кеніг катэгарычна патрабаваў павышэньня якасьці. Выступаўшыя рабочыя спрабавалі апраўдацца, гаворачы, што на якасьць хлеба зрабіла значны ўплыў зьмена падвор'я (?). Але, зразумела, прычына не ў падвор'і, а ў тым, што некаторыя рабочыя, у тым ліку старэйшыя майстры ў пагоні за рэкордамі забылі пра якасьць. Сапраўды, у адносінах колькасьці дасягнуты вялікія посьпехі.

З 15 мая ўзьнята норма выпрацоўкі: па булачным цэху на 30 проц., на выпечцы калача і французскіх булак—на 12 з палов. проц., па выпечцы абаранак—на 15 проц. Ад рабочых паступілі **54 заявы з просьбай узьняць ім нормы:** па булачным, абараначным і цукерным цэхах—на 10 проц., па хлебным—на 5 проц. Заявы ўсё яшчэ паступаюць.

Прадукцыйнасьць працы па цукерні ўзьнялася на 40-50 проц., па выпечцы калача — на 20 проц., хлеба — на 18%, французскіх булак—на 34%, абаранак—на 26%. У сярэднім прадукцыйнасьць працы ўзьнялася на 23,53%. Цяпер застаецца замацаваць дасягнутае і зьвярнуць увагу на якасьць. Рабочыя абяцаюць гэта зрабіць.

С. Я.

### На барацьбу за якасьць!

Пачаўшы сацыялістычнае спаборніцтва, калектыў гарбарні «Пралетарскі Шлях» павінен быў асабліва надзіскаць на паляпшэньне якасьці прадукцыі і падняцьце гатунковасьці. Але якраз у гэтай галіне вынікаў ніякіх няма.

У красавіку выпусьцілі скур 1-га гатунку 34,3 проц., 2-га гатунку—58,5 проц.; глум складаў 0,9 проц. У маі заўважваецца **паніжэньне колькасьці скур першага гатунку.** Першага гатунку выпушчана 29,3 проц., другога гатунку—63,09 проц.; глум павялічыўся да аднаго процанту. Дзе карэньні зла?

Мы натыкаемся на такія факты. З 306 штук скур 46 аказаліся з вялікімі парэзамі па віне мяздрыльшчыкаў і шпальтмашыны. З-за няўважлівасьці аднаго маладога рабочага частка таварy 1-га гатунку трапіла ў другі гатунак. Па віне змазчыка каля тысячы пар выцяжак было перамазана. Тут таксама атрымалася памяншэньне колькасьці 1-га гатунку.

Усе гэтыя факты нам гаворацьь аб дрэнным выканальні рабочымі ўзятых на сябе абавязкаў. Мы заўважваем некаторую нядбайнасьць майстра. Напрыклад, рабочыя гаворацьь яму, што яны будуць рабіць апрацоўку незгатаваным клеем, а ён спакойна адказвае: «Ваш абавязак варыць клей, Рабеце, як хочаце». Зразумела, рабочыя павінны гаКаб зьнізіць сабекошт прадукцыі на каз: «Рабеце, як хочаце»?

Побат з недахопамі, завод мае і дасягненьні. Вытворчая праграма за першыя 23 дні мая выканана на 115 проц. Агульны рост прадукцыйнасьці працы складае 17 проц. Прагулы ліквідаваны. Вызвалены мёртвы капітал у суме 21 тысячы руб. Большасьць цэхаў заключыла паміж сабой дагавары на спаборніцтвы. Асноўныя ўмовы дагавароў—**паляпшэньне якасьці прадукцыі.**

Каб зьнізіць сабекоштпрадукцыі на 8,2 проц., некаторыя рабочыя паменшылі свае расцэнкі на 2-5 проц.

БІРБРАЕР.

### ПОСЬПЕХІ БАБРУЙСКІХ ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫКАЎ

БАБРУЙСК. (Наш кар.). На дрэваапрацоўчых заводах Бабруйску сацыялістычнае спаборніцтва ў разгары. За май спаборніцтва дало пэўныя вынікі.

Па лесапільным заводзе № 7 за першае паўгодзьдзе бягучага году надняцьце прадукцыйнасьці працы вызначалася ў 31 проц., зьніжэньне сабекошту—11,3 проц. Прагулы і спазьненьні на працу найшлі на зьніжэньне. Вытворчая праграма за паўгодзьдзе выканана в перавышэньнем на 10 проц. Праўда завод меў некаторыя посьпехі ў гэтай справе да ўступленьня ў сацыялістычнае спаборніцтва, але апошняе дало яшчэ большы размах. Ёсьць і недахопы. Яшчэ не разварушыліся вытворчая камісія і нарада, якія зусім не абмеркавалі пытаньня аб сацыялістычным спаборніцтве. Прычынай гэтаму зьявілася тое, што адміністрацыя ня выконвае рабочых прапаноў.

Рабочыя пільні № 2 імя «Калініна» першымі заключылі дагавор аб удзеле ў сацыялістычным спаборніцтве.

Посьпехі ёсьць. Значна зьніжан сабекошт, вытворчая праграма за першае паўгодзьдзе выканана з перавышэньнем на 46 проц. Перавышэньне выкананьня праграмы, галоўным чынам, выпадае на пуск 3 зьмены. Калі ў першыя 3 месяцы было 49 прагулаў па няўважлівых прычынах, то за май няма ніводнага прагулу.

Не адстае пільня № 6 імя Вароўскага. Ня гледзячы на перашкоды, выкліканыя пажарам, прадукцыйнасьць працы паднялася на 12 проц. У маі цалкам зьніжаны прагулы па няўважлівых прычынах.

Фанэрны завод арганізаваў ударную камсамольскую групу. Гэта ўдарная група выпушчае 6-7 прэсаў, а іншыя рабочыя выпушчаюць толькі 5-6. У спаборніцтва ўступілі паасобныя зьмены, цэхі, варштаты. На заводзе выпрацоўка экспартнага тавару ў красавіку раўнялася 28 проц., у маі—40. Цалкам выканаць майскі плян, павялічылася прадукцыйнасьць працы, сталі менш выпускаць глуму.

Слабы ўдзел у правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва бяруць вытворчыя нарады і тэхнічныя працаўнікі.

Ч.

### Гэта іх не датычыць

Сход рабочых і служачых Віцебскага акрсельсаюзу, абгаварыўшы пытаньне аб сацыялістычным спаборніцтве, вынес пастанову аб удзеле ў спаборніцтве і выклікаў Магілеўскі акрсельсаюз. Асноўныя моманты спаборніцтва былі выстаўлены наступныя: давесьці каапэраваньне сялянскіх гаспадарак акругі да 1-га кастрычніка да 55 проц., сабраць у сярэднім пай 7 руб. 50 к. і 2 руб. спэцыяльных капіталаў і скарыстаць поўнасьцю і па простым прызначэньні фонды каапэраваньня беднаты. Выканаць на 100 проц. загатоўчыя пляны, у прыватнасьці па жывёлагадоўчым сырцы. Па акрсельсаюзе давесьці таварныя апэрацыі транзітам да 65 проц. і накладныя выдаткі па саюзе давесьці да 4,9 проц. да звароту.

Нам здаецца, што выстаўленыя ўмовы маюць вялікае значэньне. А вось прайшоў ужо значны час, а **магілеўцы ўпарта маўчаць.** Характэрна адзначыць, што афіцыяльны орган Наркамгандлю ВССР «Беларускі камэрцыйны бюлетэнь», рэдакцыі якога была паслана копія пастановы агульнага сходу з просьбай яго апублікаваць, не сказаў ні слова. Мы лічым, што Наркамгандаль павінен быць зацікаўлены ў спаборніцтве па засатоўках і зьніжэньні накладных выдаткаў.

Магілеўцы, ці адкажаце вы на наш выклік?

Шып.

### Няма належнага кіраўніцтва

Сацыялістычнае спаборніцтва ў Гомельскіх галоўных майстэрнях Зах. чыг. разгортваецца.

Значна вырасла адказнасьць рабочых за сваячасовае выкананьне асобных прадметаў. Прадукцыйнасьць працы павялічваецца. Працоўная дысцыпліна ўзмоцнена. Прагулы зьмяншаюцца, за апошні квартал г. г. па майстэрнях налічваецца 0,24 проц. прагулаў супроць 0,64 проц. у мінулым квартале.

Сыгналізуюць сваячасова аб усіх хібах і недарэчнасьцях, таксама яскрава асьвятляюць ход спаборніцтва насьценная «Ільлічоўка» і радыё-газэта. Апрача крытыкі агульных недахопаў радыё-газэта майстэрань дае выразныя прапановы ў сэнсе адміністратарскага і прафэсыянальнага кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам. Але трэба сказаць, што адміністратары і мясцком не рэалізавалі яшчэ ўсяго вытворчага пад'ёму працоўных. Больш як два тыдні ляжаць падпісаныя дакументы аб умовах спаборніцтва і яшчэ не афармлены.

У некаторых цэхах, напр., у кавальскім, ліцейным, часткова ў вагонным адміністратары плятуцца ў хвасьце, ня кіруючыя спаборніцтвам, а рабочыя рашуча патрабуюць ад тэхнічных кіраўнікоў плянавасьці ў рабоце.

Рабкор К. А.

### Выклікае мазырская страхкаса

Акруговая нарада ўпоўнаважаных па працы і сацыяльным страхаваньні Мазырскай акругі заслухала інфармацыю старшыні мазырскай акруговай страхкасы тав. Ждана аб сацыяльным страхаваньні батрацтва. Нарада адзначыла, што патаньне аб поўным і бесьперабойным правядзеньні ў жыцьцё справы страхаваньня батрацтва зьяўляецца вялізарнай справай палітычнага характару, што выцякае з агульнай клясавай лініі савецкай улады на вёсцы.

Асабліва ў сучасны перыяд абвастрэньня клясавай барацьбы на вёсцы пытаньні арганізацыі і абароны эканамічных інтарэсаў батрацтва маюць выключнае значэньне. А адным з галоўных відаў арганізацыі і дапамогі гэтай пралетарскай групе на вёсцы зьяўляецца правядзеньне сацыяльнага страхаваньня.

Нарада канстатавала, што норма, якая была дана Наркампрацы,—застрахаваць па акрузе 1.300 батракоў—ня выканана і на 50 проц.

Улічваючы гэта, акруговая нарада пастанавіла павялічыць гэтую норму на 15 проц., прычым у парадку сацыялістычнага спаборніцтва выклікаць на тое самае органы працы і страхаваньня Віцебскай акругі і прапанаваць ім падпісаць дагавор.

Д.

# Будзем пільна сачыць за ходам земляўпарадчых работ

**У галіне зямляўпарадкаваньня ў нас за апошнія гады былі дапушчана шмат буйных памылак—яны ў гэтым годзе павінны быць выпраўлены. Зямляўпарадчыя работы ў гэтым годзе поўнасьцю забясьпечаны сродкамі, дырэктывы даны ясныя і катэгарычныя, практыка ў нас накапілася вялікая і мы можам патрабаваць добрых вынікаў**

### МАКСІМУМ УВАГІ ЗЯМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЮ

Усе пытаньні, зьвязаныя з зямляўпарадкаваньнем і, значыцца, з формамі зямлякарыстаньня павінны прыкоўваць да сябе нашу ўвагу. Бо ўся сыстэма рэканструкцыі сельскае гаспадаркі будуецца на базе ўпарадкаваньня зямлі. Зямляўпарадкаваньне, зьнішчаючы ўсе недахопы зямлякарыстаньня—цераспалосіцу, вузкапалосіцу, дальназямельле і г. д.—моцна спрыяе крутому пералому ў сельскай гаспадарцы.

Работы па зямляўпарадкаваньні ў нас самым цесным чынам пераплятаюцца з калгасным будаўніцтвам, з вытворчым каапэраваньнем і з правядзеньнем розных агратэхнічных мерапрыемстваў. Нарэшце, у выніку зямляўпарадкаваньня мы павялічваем пасеўную плошчу—у зямельны зварот уступаюць пустуючыя зямельныя вучасткі, што дагэтуль не культываваліся і заставаліся нескарыстанымі.

### ПАТРЭБНА АБСАЛЮТНАЯ ЯСНАСЬЦЬ

Вось чаму мы павінны праяўляць асаблівую пільнасьць і ўважліва сачыць за ўсім ходам зямляўпарадчых работ, адзначаючы і выпукляючы дасягнутыя посьпехі, мы адначасова абавязаны моцна і балюча біць на недахопах, па ненармальнасьцях. Тут у нас павінна быць абсалютная яснасьць, бо толькі тады ўсё дапушчаныя скрыўленьні ў зямляўпарадчых работах трапяць у арбіту нашай увагі, і мы здолеем сваячасова і безбалюча іх выправіць.

### ЯК ТРЭБА РАСЦАНІЦЬ ЛЕТАШНЮЮ РАБОТУ?

Паглядзім зараз, што нам у мінулым годзе далі зямляўпарадчыя работы і як трэба расцэньваць іх вынікі?

У мінулым годзе ў Беларусі было зямляўпарадкавана 495.000 гэктараў—гэта складае толькі 78 проц. плянавага заданьня. На недавыкананьні пляну на 22% моцна адбілася наміма іншых прычын, недаўкамплектаваньне апарату зямляўпарадчыкаў на 17 проц.

Мы ўжо ведаем, што асноўным грахом Наркамзему ў справе зямляўпарадкаваньня было шчодрас насаджэньне хутароў і адрубоў. У нас у Беларусі хутарскія і адрубныя формы зямляўпарадкаваньня яшчэ ў 1927 г. займалі нязвычайна вялікае месца—32 проц. Праўда, ужо ў мінулым годзе гэты «хутарскі курс» некалькі зьмякчыўся, і колькасьць хутарскіх форм зьменшылася да 19 проц., але і гэтая лічба для нас праз меру вялікая і недапушчальная.

У мінулым годзе была арганізавана вялікая колькасьць новых калгасаў—344. Але бяда была ў тым, што гэтыя калгасы ў сваёй большасьці былі дробныя, карлікавыя (5-7 сем'яў), так што плошча зямлі, занятай пад калгасы, павялічылася зусім мала.

Разам з дробнымі калгасамі ў нас таксама насаджаліся і дробныя пасёлкі, пазбаўленыя пэрспэктыў далейшага гаспадарчага разьвіцьця і калектывізацыі.

### ШМАТ НЕНАРМАЛЬНАСЬЦЯЙ У РАБОЦЕ

Мы павінны падкрэсьліць яшчэ рад недахопаў і ненармальнасьцяй, таксам даволі буйных, што ішлі побач з зямляўпарадчымі работамі ў мінулым годзе.

Вялікая ненармальнасьць заключалася ў тым, што зямляўпарадкаваньне праводзілася не на суцэльных зямельных плошчах, а раскідана, у выбарачным парадку (паасобных заяўках). Зразумела, пры такім спосабе зямляўпарадчых работ іх цяжка ўвязваць з агратэхнічнымі мерапрыемствамі, і эфэкт ад зямляўпарадкаваньня ў значнай меры зьнікае.

Вялікая колькасьць калгасаў (звыш 100), асабліва з ліку тых, што былі створаны ў другой палове пасеўнага пэрыяду, не ўвайшлі ў плян і засталіся незямляўпарадкаванымі—гэта было адхіленьне ад дырэктывы, якая часаў прыводзілца да развалу калгасаў

Зразумела, вынікі былі-б лепшыя (больш калектываў і менш хутароў), калі-б перад зямляўпарадчымі работамі разгорнута была добрая падрыхтоўчая растлумачальная работа. Але гэтага ня было.

### НАМ ЗНОЎ ПАГРАЖАЕ НЕВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ

Мы і ў гэтым годзе маем значны недахват тэхнічнага пэрсаналу—па 20-22 проц. І мы амаль што з упэўненасьцю можам сказаць, што плян зямляўпарадчых работ (павялічаны ў параўнаньні з мінулым годам на 25 проц.) і ў гэтым годзе ня будзе выканаць поўнасьцю.

Дзе прычыны гэтага пагражаючага становішча, якое не дае нам мажлівасьці выконваць пляны зямляўпарадкаваньня? Тыя кадры, што ёсьць у Беларусі (зямельны факультэт с.-г. акадэміі і Магілеўскі зямляўпарадчы тэхнікум), Наркамзем вычарпаў поўнасьцю. Уся-ж бяда ў тым, што ўмовы аплаты работы ў іншых раёнах Саюзу вышэйшыя, чым у нас. А ў той-жа час работа ў Беларусі, пры вучасткова-падворным парадку зямлякарыстаньня, больш цяжкая і складаная, чым у другіх мясцовасьцях. А ў выніку гэтага кожны год ад нас перабягаюць у іншыя раёны СССР 60-70 кваліфікаваных працаўнікоў.

Аб гэтых акалічнасьцях, якія падрываюць зямляўпарадкаваньне, мы кожны год гаварым, але яшчэ дагэтуль не прынялі рашучых крокаў да канчатковага ўрэгуляваньня гэтай справы.

### ДЫРЭКТЫВЫ ДАНЫ—ІХ ТРЭБА ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ

Мы ў гэтым годзе, адкідаючы ад сябе ўсе мінулыя памылкі, павінны строга выконваць даныя партыяй і ўрадам катэгарычныя і ясныя дырэктывы.

У гэтым годзе абсалютна ня можа быць дапушчана насаджэньне хутарскіх і адрубных форм зямлякарыстаньня, якія ідуць у разрэз з усёй нашай зямельнай палітыкай, якія абмяжоўваюць гаспадарчыя мажлівасьці і ўкараняюць індывідуальныя тэндэнцыі ў сялянскім насельніцтве і якія моцна тармозяць сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

Дана жорсткая дырэктыва аб тым, каб пасёлкі арганізоўваць **буйныя,** з плошчай ня менш прыкладна 200 гэктараў.

З другога боку, невялікія вёскі трэба ўпарадкаваць на месцы без расьсяленьня і без разьбіўкі на пасёлкі. Што менш ламае гаспадарку і эканоміць сялянскія сродкі. У такіх зямляўпарадкаваных вёсках, што застаюцца па месцы, будуць толькі перапляніваны сялібы, пабудаваны шматпалёвы севазварот з ліквідацыяй вузкапалосіцы.

Вельмі важна таксама і тая акалічнасьць, каб зямляўпарадкаваньне было ў максымальнай ступені зьвязана з калектыўным будаўніцтвам. Пры гэтым трэба безадкладна ўпарадкаваць тыя вёскі, з якіх калгасы выдзяляюцца.

І яшчэ адно—мы пры зямляўпарадкаваньні павінны аказваць вялікую дапамогу беднаце, накідаючы для іх лепшыя вучасткі і ўсялякімі спосабамі вызваляючы іх ад кулацкай залежнасьці.

### БУДЗЕМ ЧАКАЦЬ ДОБРЫХ ВЫНІКАЎ

Калі і ў гэтым годзе нам пагражае колькаснае недавыкананьне пляну, дык мы з тым большай энэргіяй павінны націснуць на якасны бок.

Сродкамі зямляўпарадчыя работы забясьпечаны поўнасьцю, дырэктывы даны катэгарычныя і выразныя, практыка ў нас накапілася багатая і мы можам і будзем чакаць добрых вынікаў.

А пакуль што будзем уважліва і пільна сачыць за ходам работ, каб мець мажлівасьць сыгналізаваць аб усіх скрыўленьнях і скажэньнях, калі яны дзе-небудзь будуць праяўляцца.

Л. НЯФЕДАЎ.

# Друк і асеньняя пасеўная кампанія

Адной з умоў пасьпяховага правядзеньня асеньняй пасеўкампаніі, трэба лічыць мабілізацыю грамадзкай думкі вакол тых задач, якія ў сувязі з пасеўкампаніяй трэба вырашыць. Пасеўкампанія не абмяжоўваецца толькі засевам азімага кліну. Наадварот, як у часе падрыхтоўкі, так і ў часе самой сяўбы **нам трэба вырашыць цэлы комплекс мерапрыемстваў, які вынікае і грунтуецца на асноўных задачах сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ўзмацненьня калектывізацыі яе.** Абмежаванае пасеўкампаніі толькі такімі задачамі (хоць і важнымі, зразумела), як пашыраньне пасеўнай плошчы ці павялічэньне ўраджайнасьці, спрашчае ўсю справу, уносіць ніправільнае разуменьне абавязкаў нашых земельных органаў, каапэрацыйных арганізацый, усей савецкай грамадзкасьці. Справа значна складаней і з гэтага пункту погляду трэба разгортваць усю падрыхтоўку да сяўбы.

Перад друкам (у даным выпадку газэтамі) стаіць задача: з поўным разуменьнем усей складанасьці мерапрыемстваў **разгарнуць падрыхтоўчую працу такім тэмпам, каб дабіцца ня толькі належнай інфармацыі шырокіх колаў савецкай грамадзкасьці аб усіх задачах пасеўкампаніі, але каб пры дапамозе самакрытыкі, грамадзкага кантролю, высьвятленьня нядбайнасьці апарату і аддзельных асоб зрабіць немагчымым невыкананьне тых лімітаў, якія даны постановай СНК.**

На падставе папярэдніх пасеўкампаній мы маем поўную магчымасьць сказаць, што ніякі апаратны кантроль, рэвізіі, так хутка не дапамагаюць вытравіць хібы, падштурхнуць, дзе трэба, як гэта могуць і павінны зрабіць газэты. Друк, як прылада сацыялістычнага будаўніцтва, павінен «пытаньні штодзённай эканомікі несьці на суд масы» (Ленін), брацьь пад абстрэл усіх тых, хто нядбайнасьцю ці ультыватызмам зьнижае эфэкт сацыялістычнага будаўніцтва, зрывае пляны сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Адначасова газэты павінны па ўсіх галінах падрыхтоўкі да сяўбы шырока асьвятляць лепшыя прыклады працы, ажыцьцяўленьнем мерапрыемстваў, зьвязаных з асеньняй пасеўнай кампаніяй. Друк павінен прадбачыць усё, што можа прадпрыняць кулацкі элемэнт вёскі з мэтай арыву пасеўкампаніі і своечасова мабілізаваць бяднацка-серадняцкія масы для адпору кулацкім намерам агітацыі захадам.

3. **Максымальная ўвага калектывізацыі і каапэрацыі.**

Вышэй адзначалася, што ўсе мерапрыемствы асеньняй пасеўнай кампаніі павінны вырашацца на грунце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, узмацненьня яе калектывізацыі. Сацыяльна-тэхнічная рэканструкцыя—посьпех нашае работы ў сельскай гаспадарцы. На XVI партканфэрэнцыі тав. Калінін казаў, што «калі меркаваць па газэтах, дык як быццам мясцовыя органы як партыйныя, так і савецкія, значна больш аддаюць увагі, напрыклад, каапэрацыі, чым с.-г. палатку. Але гэта далёка ня так. Наадварот, с.-г. палатку, ня гледзячы на тое, што аб гэтым у газэтах ня пішацца, значна больш увагі аддаецца, чым пытаньню аграмаджаньня сельскае гаспадаркі».

Дабіцца пералому ў рабоце нашага асабліва нізавога апарату, паставіць справу так, «каб пытаньне аграмаджаньня сельскае гаспадаркі, разьвіцьця калектывізацыі зрабілася асялком нашай штодзённай практычнай работы»—цэнтральная задача друку. Тут трэба ўзяць пад кантроль зьверху да нізу, як на практыцы ажыцьцяўляецца дапамога аграмаджанаму сэктару сельскай гаспадаркі, як кожны працаўнік (зямельны, каапэрацыйны, грамадзкі) выконвае задачу калектывізацыі і каапэраваньня. Трэба патрабаваць, каб калектывізацыя ня была толькі лёзунгам у вуснах таго ці іншага працаўніка, а каб яна была жывой справай, вынікі якое відаць для **ўсіх.**

На практыцы мы часта маем зьявішчы, калі на мясцох усю працу па аграмаджаньні сельскай гаспадаркі прабуюць зьвесьці да фармальнага выкананьня гадавога пляну калектывізацыі і каапэраваньня. Абмежаваньне колькасьцямі паказальнікамі няўвага да якасьці, прыводзіць да такіх выпадкаў, калі арганізаваны калгас у той-жа год не зямляўпарадкуецца, калгасы арганізуюцца дробныя, арганізацыя гаспадаркі калгасу зацягваецца на некалькі год, калгас несваячасова атрымлівае крэдыт, насеньне, угнаеньне, машыны агрэгамічэньне, і г. д. Змаганьне з такімі да справы абагуленьня гаспадаркі—абавязак усіх нашых газэт. Барацьба за якасьць у вытворчым каапэраваньні і калектывізацыі, папулярызацыя працы лепшых камун, калгасаў, вытворчых каапэратываў—штодзённая задача нашага друку.

Поруч з гэтым трэба рашуча ставіць пытаньне аб узмацненьні ўплыву сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі на індывідуальны. Пашырэньне ўплыву павінна адбывацца як шляхам арганізацыі новых калгасаў, так і шляхам узмацненьня дапамогі наўкольнай беднаце. Саўгасы і калгасы павінны дапамагчы беднаце інвэнтаром, насеньнем, уборкай ураджаю, запашкай поля, рамонтам інвэнтару і г. д. Агрыкультурная роля саўгасу і калгасу на вёсцы павінна з кожным годам узмацняцца. Друк павінен не выпускаць гэтага моманту з-над увагі і шырока асьвятляць як задачы сацыялістычнага сэктару, так і практычную працу кожнага саўгасу, камуны, калгасу ў гэтай галіне.

4. **Мабілізацыя мас і самадзейнасьць сялянства.**

Усе задачы, якія мы павінны вырашыць у сувязі з асеньняй сяўбой, толькі тады з посьпехам будуць выкананы, калі ў вырашэньні іх будуць браць удзел масы бяднацка-серадняцкага сялянства. Падняцьце гаспадарчай ініцыятывы і самадзейнасьці сялянства дасьць магчымасьць больш поўна выканаць нашы пляны, мабілізаваць усе сілы і сродкі самога сялянства. «Необходимо добиться того, чтобы отп

# Арганізацыя фасфарытнай вытворчасьці ў БССР

### Пабудова Крычаўскага заводу

Праект пабудовы Крычаўскага фасфарытнага заводу прадугледжвае, што завод будзе вырабляць кожны год у адну зьмену каля 8.500 тон угнаеньняў. Кошт пабудовы —450.000 р. Будаўніцтва заводу перадана Белдзяржбуду.

### Абсталяваньне Клімавіцкага млыну

Своечасовы пуск у ход Клімавіцкага фасфарытнага млыну залежыць ад арганізацыі мыечнага аддзяленьня. Гэтае аддзяленьне неабходна для таго, каб прамываць руду, якая зьмешана з крышталічнай галькай. Адзіная ў СССР арганізацыя «механообработка» згадзілася ў парадку вопыту запраектаваць мыечнае аддзяленьне. Адначасова запрапанавана зрабіць праект і мясцовым спэцыялістым.

### Досьледы ракі Сож

Зараз на вучастку Бахраўкі-Гразі ідуць досьледы ракі Сож, каб выявіць, ці эканамічна карысна перавозіць фасфарытную руду вадой.

Для гэтай мэты мяркуецца пабудаваць каля 20 суднаў-лайб і набыць 2 буксырныя параходы і моторны човен.

# Галавацяпы і іх справы

## Чакаюць пляну

Каштарысам 1928-29 году прадугледжана пабудова сямігодкі ў Сьвілацкім раёне, Бабруйскае акругі (гэта адна сямігодка па ўсю акругу). Ёсьць сродкі, закуплен лес і іншыя матар'ялы. Усе чакаюць, калі пачнуць будаваць, бо зараз увесь Сьвілацкі раён абслугоўваецца толькі аднэй сямігодкай, якая ня можа ахапіць і 20 проц. усіх, што жадаюць вучыцца ў сямігодцы. Але будаўніцтва нельга распачаць таму, што Наркамасьветы ня прыслаў да гэтага часу пляну. З студзеня месяца пішам, звонім, патрабуем прысылкі пляну. Пісалі ў акрвыканком шмат раз, пісалі ў Наркамасьветы.

Заходзілі ў Наркамасьветы і члены прэзыдыуму РВК і патрабавалі прысылкі пляну. Акрвыканком з свайго боку таксама пісаў і патрабаваў і ў маі месяцы напісай у наркамат РСІ. І вось атрымалі мы паведамленьне ад Наркамасьветы, што 25-V будзе «абавязкова без затрыманьня выслан плян». 5 чэрвеня ляжаць горы лесу, каменьня, вядзецца шпаркім тэмпам падрыхтоўчая праца, працуюць дзесяткі рабочых, а пляну, як ня было, так і няма. Што будзе? Гэта пагражае стратамі тысяч рублёў і зрывам будаўніцтва. Хто дапаможа?

МЯСЦОВЫ.

## „Маленькая" недарэчнасьць

Загадаў Белсельтрэст саўгасу Капстанціпава (Капаткевіцкага раёну, Мазыршчына), адправіць не патрэбныя трубы ў саўгас Высокае (Аршанскай акругі). У выкананьне загаду Белсельтрэсту, загадчык саўгасу Капстанціпава адпраўляе трубы (памятайце, каштуюць трубы 14 руб.) на станцыю Пціч для адпраўкі па прызначэньні ў Аршанскую акругу.

Але здарылася «маленькая» недарэчнасьць. Адзін з чыноўнікаў станцыі Пціч ня так заадрасаваў накладную, і трубы пайшлі калясіць па ўсім Савецкім Саюзе. Прыбылі трубы на станцыю Высокае Цьвярской губэрні, адміністрацыя станцыі Высокае адправіла трубы на станцыю Масквата-варная. Пачалася перапіска ў зьвязку з гэтай адпраўкай труб. Адміністрацыя чыгункі прадставіла саўгасу Канстанцінава рахуначак паступнага зьместу: «просім заплаціць за хаваньне грузу на працягу 88 дзён 45 рублёў, за правоз труб па чыгунцы 57 р. 33 кап., за адпраўку труб з станцыі Высокае, Цьвярской губэрні, да станцыі Масква—15 руб. 70 кап. Усяго па рахунку 127 руб. 50 к.

— Чыгунка затраціла на перавозку труб, якія каштавалі 14 руб., 127 руб. 50 к. з-за чаго? З-за таго, што па станцыі Пціч сядзеў чыноўнік, які пераблытаў накладную замест таго, каб заадрасаваць трубы па ст. Стайкі для саўгасу Высокае, ён іх заадрасаваў на станцыю Высокае, Цьвярской губ.

Цікава, хто заплаціць затрачаныя 127 руб. 50 к.

Б. Ш.

## Дэпо на адну машыну і дзьве бочкі

Даўно было пастаўлена пытаньне аб пабудове на станцыі Негарэлае пажарнага дэпо. У сучасны момант дэпо ўжо будуюць. Але разьмер дэпо 4,4 мэтраў шырыні на 6,4 м. даўжыні. Дэпо ўмесьціць адну пажарную машыну і дзьве бочкі ў той час, як ёсьць інвэнтар у пажарнай дружыны—тры пажарныя машыны і 7 бочак. У такім выпадку большая палова пажарнага інвэнтару будзе паранейшаму знаходзіцца пад адкрытым небам.

На пабудову дэпо траціцца 1.300 руб. Лішнія канцы ад бярвеньняў па 2-3 мэтр. адразаюцца і ідуць на дровы. Гэта называецца патаньненьне будаўніцтва.

Рабочыя і служачыя станцыі Негарэлае вельмі абураны гэтай акалічнасьцю і просяць зьвярнуць увагу на галавацяпства

Т.

## Растратчыкаў гладзяць па галоўцы

Кульшыцкае каапэрацыйнае аддзяленьне Прапойскага спажывецкага таварыства (Магілеўская акруга) «змагаецца» з недахопамі ў краме. Калі працаўнік Казанцаў Янка растраціў 95 рублёў, праўленьне не прад'явіла яму іску, справу не перадала для прыцягненьня вінаватага да крымінальнай адказнасьці, а абмежавалася толькі зьняцьцем яго з работы.

На гэту пасаду прызначылі другога прыказчыка, бадзёрага хлапца, маладога, які любіць салодкае есьці і пагуляць з шыкам. Па прыкладзе Казанцава, паколькі апошняга за растарту праўленьне пагладзіла па галоўцы, новы прыказчык Ліхачоў растраціў 301 р. Напэўна праўленьне пагладзіць і Ліхачова па галоўцы.

ПАДАРОЖНЫ.

## 19-га чэрвеня пачынаецца чыстка ЦСУ

У зьвязку з прызначэньнем т. Вансоўскага на іншую работу—старшынёй камісіі па чыстцы ЦСУ прызначан тав. ДРЫЛЕНКА (нам. старшыні Цэнтральнага Савету ТДА Авіахім).

Члены камісіі прымаюць вусныя заявы ў памяшканьні НК РСІ Бел., 2-гі паверх, пакой № 5 штодзенна ад 6 да 8-мі гадз. увечары да 16-га чэрвеня ўключна.

Чыстка ЦСУ пачынаецца на адкрытым пасяджэньні камісіі 19-га чэрвеня ў памяшканьні клюбу Саўгандальслужачых, а 6-й гадз. увечары.

Запрашаюцца рабочыя, дэлегаткі, члены гарсавету, служачыя і ўсе працоўныя.

# Мы чакаем матар'ялаў аб рабоце апарату

## ЗАКЛІК ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ АПАРАТУ ДА ПРАЦОЎНЫХ БССР

З 1-га чэрвеня органы РСІ Беларусі прыступілі да непасраднай працы па праверцы і чыстцы апарату.

Правяраюча будуць усе без выключэньня працаўнікі апарату ўсіх звеньняў яго, пачынаючы з цэнтральных органаў і канчаючы працаўнікамі раённых і сельскіх установаў. У першую чаргу РСІ прыступае да чысткі апарату наступных органаў: у першай палове чэрвеня—СТАТЫСТЫЧНЫХ і апарату БІРЖ ПРАЦЫ; з 1-га ліпеня—БАНКАЎСКІХ, ДЗЯРЖСТРАХАЎСКІХ І СУДОВА-СЬЛЕДЧЫХ і з 10-га ліпеня—ФІНАНСАВЫХ і ЗЯМЕЛЬНЫХ.

Для таго, каб правесьці найбольш поўную і дакладную праверку ўсяго складу служачых і выявіць у апараце асоб, шкодных нам сваёй работай, неабходна ўсёй савецкай грамадзкасьці, усім рабочым, батраком, сялянам, чырвонаармейцам, усім працоўным наогул зараз-жа ўзяць пад абстрэл паказаныя ўстановы. Неабходна выкрыць усе агіднасьці і непарадкі ва ўстановах: невыкананьне ці скажэньне савецкіх законаў; выкрыўленьне клясавай лініі; цяганіну і бюракратызм; грубыя, зьняважлівыя, высокамерна-чыноўнічыя паводзіны з працоўнымі; праява нацыянальнай розьні і шавінізму; растраты і хабарніцтва; скарыстаньне службовага становішча ў шкурных інтарэсах; подырніцтва і прагулы і г. д.

Да гэтага часу падрыхтоўка да чысткі ішла па лініі зьбіраньня матар'ялу на аддзельных асоб, калі таму, хто паведамляў гэты матар'ял, ужо вядома, хто ў тым ці іншым выпадку пэрсанальна вінаваты. Не паспабляючы работы ў гэтым напрамку, зараз неабходна пашырыць падрыхтоўку да чысткі, трэба праверыць работу апарату наогул і выявіць недахопы, недалікі і агіднасьці, незалежна ад таго, што ў некаторых выпадках гэтыя недахопы могуць на быць вынікам простага шкодніцтва асоб, а будуць залежаць ад дрэнай сыстэмы работы, ад грамоздкай структуры, ад недакладнага разьмеркаваньня правоў і абавязкаў і інш. агульных умоў работы. Але дзеля таго, што задача чысткі апарату не абмяжоўваецца і не канчаецца толькі тым, што з якой-небудзь установы мы выганяем 5-10 служачых, а заключаецца яшчэ і ў тым, што мы павінны павысіць якасьць работы наогул, то праверка работы апарату набывае вялізарнейшае значэньне.

У лініі органаў РСІ такая праверка арганізавана, але ўсялякая вялікая справа ня можа даць вычэрпваючых вынікаў, калі ў гэту справу ня будуць уцягнуты шырокія колы мас працоўных і грамадзкія аранізацыі.

Цэнтральная камісія па чыстцы апарату ґ зьвяртаецца з заклікам да ўсіх працоўных БССР і грамадзкіх арганізацый усямерна дапамагчы справе праверкі работы апарату шляхам паведамленьня органам РСІ ці ў прэсу ўсяго таго, што ім вядома дрэннага аб рабоце, аб лініі, аб парадках ва ўстановах, падпягаючых чыстцы.

Ня менш важную ролю ў выяўленьні недахопаў работы апарату павінны адыграць і савецкія ўстановы.

У гэтых адносінах ужо зараз, у мэтах чысткі апарату, неабходна прыняць да выкананьня дырэктыву XVI-й партканфэрэнцыі аб «узаемным кантролі распараджэньняў цэнтру практыкай месц і практыкі месц кіраўніцтвам цэнтру».

Гэта магчыма ажыцьцявіць наступным чынам:

Ніжэйшыя органы, на падставе свайго датыканьня з вышэйшымі падбіраюць са свайго матар'ялу тыя моманты работы, якія косяць характар бюракратызму ці цяганіны з боку вышэйшых, ці скрыўленьне клясавай лініі, ці наогул няправільнага вырашэньня пытаньняў, ці несваячасовага вырашэньня і г. д.—словам, ніжэйшыя органы падбіраюць матар'ял, характарызуючы тыя ці іншыя адмоўныя моманты работы апарату вышэйшых. Гэтыя апошнія ў сваю чаргу таксама падбіраюць матар'ял аб рабоце ніжэйшых, дабавіўшы сюды выпадкі невыкананьня ці скрыўленьня іх дырэктыў, зацяжку ў выкананьні распараджэньняў і г. д.

Гэткім узаемна-перакрыжаваным выкрыцьцём недахопаў работы, побач з матар'ялам ад паасобных працоўных і грамадзкіх арганізацый можна будзе атрымаць правільнае і поўнае ўяўленьне аб недахопах нашай работы, а разам з гэтым, зразумела, удасца зьнішчыць і самыя недахопы.

Усе даны аб рабоце паказаных вышэй органаў—могуць быць пераданы ці непасрэдна ў органы РСІ, ці ў насьценгазэты, ці ў агульную прэсу, ці ў спэцыяльныя скрыні для заяў, якія ўводзяцца ва ўсіх установах ад імя камісій па чыстцы, ці, урэшце, вусным паведамленьнем камісіям па чыстцы. Куды-бы гэтыя матар'ялы не папалі, яны прынясуць вялікую карысьць.

Пасьпяховае выкананьне чысткі цалкам залежыць ад актыўнасьці працоўных і найбольш поўнага ажыцьцяўленьня паказаных мерапрыемстваў усімі тымі органамі і ўстановамі, якія павінны быць датычны да гэтай вялікай і важнай справы.

Без актыўнай дапамогі ўсіх працоўных і грамадзкіх арганізацый нельга пасьпяхова правесьці чыстку і аздараўленьне апарату.

Гэту дапамогу неабходна атрымаць у агульных інтарэсах нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ АПАРАТУ БССР.

УВАГА. — Камісія просіць усе насьценгазэты і друкаваныя газэты калектываў перадрукаваць гэту адозву.

## Аб звальненьнях не па чыстцы апарату

Зараз у некаторых акр. РСІ назіраюцца выпадкі падвядзеньня пад чыстку апарату звальненьняў служачых па розных матывах, якія не абвяшчаюцца самім звальняемым, а замест падрабязных і дакладных матываў робяцца толькі агульныя спасылкі на рашэньні РСІ.

Выходзячы з гэтага НК РСІ прапануе ўсім органам РСІ і ўсім савецкім установам кіравацца наступным:

1. Усялякае звальненьне хаця-б і па прапанове РСІ, але не па лініі чысткі апарату і не ў парадку, прадугледжаным для чысткі,—разглядваць як звальненьне, якое не павінна перашкаджаць як залічэньню на біржы працы, гэтак і пасылцы і прыёму на работу, калі няма спэцыяльных аговорак наконт абмежаваньня права на далейшую работу.

2. У дакуманце, які выдаецца на рукі звальняемаму (не ў парадку чысткі) пад адказнасьцю асобы, выдаючай дакумант, павінна вычарпальна дакладна паказвацца, па якіх прычынах праводзіцца звальненьне і якія абмежаваньні ў далейшым распаўсюджваюцца на звальняемага.

3. Пры звароце зволенага на біржу працы, або пры пасылцы яго на работу ні біржа працы, ні установа, у якую пасылаецца на работу беспрацоўны, ня маюць права запатрабаваць ад звольненага ніякіх дадатковых даведак, выпісак, дакумантаў наконт прычын апошняга яго звальненьня, кіруючыся выданым на рукі дакумантам і кодэксам працы.

Нам. Наркома РСІ БССР

РЫСКІН.

# МЕНСК

## Паездка рабочых БССР па яўрэйскіх калгасах

Прэзыдыум ЦСПСБ нядаўна пастанавіў арганізаваць экскурсіі беларускіх, польскіх і рускіх рабочых у яўрэйскія калгасы. Мэта гэтых экскурсій—пазнаёміць шырокія рабочыя масы з палітыкай партыі і савецкай улады ў галіне перабудовы эканомікі і быту працоўных яўрэяў і дасягненьнямі яўрэйскіх земляробаў

У экскурсіях прыме удзел 30 чал. 15 экскурсантаў выедуць 25 чэрвеня ў яўрэйскія калгасы БССР, а решта 15 рабочых выедуць 1 ліпеня ў яўрэйскія калгасы Крыму.

Экскурсанты прабудуць там 2 тыдні і за гэты час дэтальна азнаёмяцца з жыцьцём яўрэйскіх калгасьнікаў.

У Менску на буйных прадпрыемствах пачалося ўжо правядзеньне агульных сходаў рабочых, на якіх выбіраюцца дэлегаты ў экскурсіі.

## Зарплата навуковых працаўнікоў павышаецца на 30 проц.

З новага навучальнага году зьмяняецца сыстэма аплата навуковых працаўнікоў. Замест пагадзіннай аплаты ўводзіцца месячная. Гэта палепшыць эканамічнае становішча навуковых працоўнікоў павысіць іх заработак прыблізна на 30 проц., а самае галоўнае, зьменшыць нагрузку, каб даць магчымасьць навуковым працаўніком займацца больш навукова дасьледчай працай.

## Упарадкаваньне савецкай вуліцы

Прэзыдыум гарсавету запрапанаваў Эльводу і ўсім арганізацыям, якія праводзяць земляныя работы на Савецкай вуліцы, паскорыць тэмп гэтых работ з тым, каб яны былі скончаны да 1 ліпеня. Пасьля гэтага тэрміну на Савецкай вуліцы будуць разгорнуты выключна трамвайныя работы. Гарсавет абавязаў камгас сачыць за работамі па Савецкай вуліцы і заслухоўваць ня менш двух раз у дтызень даклады будаўнічых арганізацый

## 4.500 падпісчыкаў на творы Леніна на беларускай мове

Выданы трэці том твораў Леніна на беларускай мове, прыступлена да выданьня іншых тамоў. Ужо падрыхтаваны і здаецца ў друк 5-ты том.

Тыраж 3-га тому быў вызначаны у 2000 экзэмпляраў, але зараз ужо ёсьць 4.500 падпісчыкаў. Такім чынам, наступныя тамы прыдзецца друкаваць у большым ліку экзэмпляраў.

Работа па выданьні 12-цітомніка твораў Леніна на беларускай мове будзе скончана да 1 студзеня 1931 г.

Прэзыдыум ЦВК даручыў эканомнакрадзе пры СНК БССР разгледзець раштарыс на далейшае выданьне твораў Леніна

## Водпуск тав. Чарвякову

Згодна пастановы прэзыдыуму ЦВК БССР, старшыня ЦВК БССР тав. Чарвякоў выехаў у паўтарамесячны водпуск.

Выкананьне абавязкоў старшыні ЦВК БССР на час водпуску т. Чарвякова ўскладзена на т. Хацкевіча.

## Пабудова ўзорнага дзіцячага дому

Прэзыдыум ЦВК, у выкананьне пастановы юбілейнай сэсіі ЦВК БССР, пастанавіў пачаць пабудову ўзорнага дзіцячага дому ў 1930 г. з тым, каб скончыць пабудову ў 1931 г. Месцам пабудовы вызначан г. Магілеў. Дом разьлічаны на 400 дзяцей.

## З залі суду

### Гвалтаўнікі

РУДЗІНСКІ Адам і АЎГАСТОЎСКІ Аляксандар зґвалтавалі батрачку Р. М., а пасьля зьдзекваліся з яе. Калі яны дазналіся, што іх ахвяра падае ў суд, яны, каб пазбавіцца ад адказнасьці, абяцалі пакрыўджанай па 50 р. Мазырскі нарсуд прыгаварыў абвінавачаных да пазбаўленьня волі: Рудзінскага на адзін год, а Аўгастоўскага на поўтара. Па амністыі кара зьменшана на палову.

## Да чысткі акрстатбюро

22-га чэрвеня пачынаецца чыстка Менскага акруговага статыстычнага бюро. Супрацоўнікі праходзяць чыстку ў альфабэтным парадку ў дзьве чаргі: першая чарга—на адкрытым пасяджэньні камісіі па чыстцы 22-га чэрвеня ў памяшканьні клюбу гарсавету (пляц Волі буд. акрвыканкому), а 6 гадз. увеч. і другая чарга—тамжа, 23 чэрвеня, а 12 гадз. дня.

Запрашаюцца рабочыя, дэлегаткі, члены гарсавету, служачыя і ўсе працоўныя.

Камісія па чыстцы.

# ЗЯМЕЛЬНЫЯ ОРГАНЫ НЯДБАЙНА АДНОСЯЦЦА

## да справы правядзеня конкурсу на лепшы раён

Сацыялістычнае спаборніцтва ў сацыялістычным сэктары сельскае гаспадаркі Беларусі ўсё яшчэ разгортваецца. Па радзе калгасаў і саўгасаў можна адзначыць пэўныя вынікі, якіх яны ўжо дасягнулі ў ходзе спаборніцтва.

Рабочыя саўгасу «Новыя Зялянкі», Чэрвеньскага раёну, пасьля выкліку на спаборніцтва, добра ўзяліся за работу. Яны, акрамя таго, што адрамантавалі ўвесь саўгаскі інвэнтар і ўгнаілі ўсю пасеўную плошчу, зрабілі таксама вялікую дапамогу наўкольнаму сялянству. Было ачышчана каля 250 тон сялянскага насеньня і адрамантаваны інвэнтар беднаты. Рабочыя ўзялі таксама шэфства над акружаючымі саўгас пасёлкамі.

Пастаноўлена сёлета ўзьняць ураджайнасьць на 25 проц. і зьменшыць сабекошт прадукцыі на 10 проц.

Саўгас Ануфрава, які прымае ўдзел у спаборніцтве, засеяў 50 проц. плошчы радковым насевам. Увесь пасеў утвораны толькі на ўгноенай глебе і чыстагатунковым насеньнем. Гэты саўгас, дзякуючы сацыялістычнаму спаборніцтву, сапраўды робіцца прыкладам для сялянства, як культурная гаспадарка. Сёлета рабочыя гэтага саўгасу ўпяршыню выйшлі ў поле на тыдзень раней, чым гэта зрабілі сяляне.

З саўгасаў і калгасаў спаборніцтва перакідваецца ў с.-г. каапэрацыю. Цэнтральны малочна жывёлагадоўчы саюз пастанавіў прэміяваць асобныя каапэрацыйныя аб'яднаньні, а таксама і спэцыялістых.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія ў нізавой с.-г. каапэрацыі скарыстоўваецца для папулярызацыі сацыялістычнага спаборніцтва.

Трэба, аднак, адзначыць, што Менскі сельскі крэдытны саюз узяў няправільны напрамак у справе разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва. Менселькрэдытсаюз распрацаваў плян правядзеньня спаборніцтва габінэтным парадкам, вызначыўшы дакладна тэрміны, у якія кожная каапэрацыйная арганізацыя павінна выклікаць на спаборніцтва другую.

Калі спаборніцтва больш-менш здавальняюча разгортваецца на калгасах і саўгасах і паступова ахапляе с.-г. каапэрацыю, дык зусім ня так у вогуле стаіць справа ў вёсцы. У справе разгортваньня спаборніцтва паміж вёскамі зямельнымі органамі зроблена яшчэ вельмі мала. Вось характэрныя факты. Менскі акрземаддзел на запытаньне, як праходзіць спаборніцтва ў вёсцы, адказаў:

— Ніяк.

У свой час СНК БССР пастанавіў правесьці конкурс на лепшы раён па сельскай гаспадарцы. На гэтую справу выдзелена поўмільёна рублёў, якія будуць скарыстаны, як прэміі для лепшых раёнаў. На запытаньне Наркамзему, што Бабруйскі акрземаддзел практычна робіць у справе правядзеньня конкурсу, быў такі адказ:

— Мы далі дырэктыву ўсім раёнам удзельнічаць у конкурсе...

І гэтым абмежаваліся.

Віцебскі і Полацкі акрземаддзелы да гэтага часу яшчэ ня вылучылі нават раёнаў, што павінны прымаць удзел у конкурсе.

С.

# На пленуме ЦБ пралетстуду

## Бесьперапынная вытворчая практыка

15 чэрвеня ўвечары пленум заслухаў даклад інспэктара па вышэйшых навучальных установах Беларусі т. Лысова аб пераводзе навучальных устаноў на бесьперапынную вытворчую практыку.

Бесьперапынная вытворчая практыка ўводзіцца з мэтай увязаць тэарытычную працу навучальных устаноў з практычнай работай нашых прадпрыемстваў. Практыка будзе праводзіцца шляхам пасылкі на працягу ўсяго навучальнага году студэнтаў на прадпрыемствы і ва ўстановы. Але ўвесьці гэтую практыку ва всіх навучальных установах адразу немагчыма.

У спрэчках выступалі т. т. Мазарэцкі, Грузакоў, Башмачнікаў, Гурвіч і інш.

Выступаўшыя зазначалі, што ня гледзячы на тое, што праз 2 месяцы пачынаецца новы навучальны год, а таксама на дырэктыву, даную яшчэ год таму назад ліпнёўскім пленумам ЦК УсеКП(б), да гэтага часу ў пытаньні аб бесьперапыннай вытворчай практыцы няма належнай канкрэтнасьці. Навучальныя праграмы дагэтуль не прыстасаваны да прахаджэньня вытворчай практыкі, Трэба, каб навучальны год быў разьмеркаваны наступным чынам: 1/3 — на тэарытычныя заняткі, 1/3—на працу ў майстэрнях і лябараторыях і 1/3 часу непасрэдна на працу на вытворчасьці (фабрыка, завод, школа, больніца, саўгас). Наркамасьветы трэба так павесьці работу, каб з 1-га верасьня можна было перайсьці на бесьперапынную вытворчую практыку ў большасьці навучальных устаноў, у тым ліку мэдычных, пэдагагічных і сельска-гаспадарчых.

16 чэрвеня на пленуме быў заслухан даклад старшыні Галоўнавукі БССР т. Некрашэвіча аб падрыхтоўцы маладых навуковых працаўнікоў.

## Наймовая праца ў сялянскіх гаспадарках

ЦВК і СНК БССР зацвердзілі пастанову аб наймовай працы ў сялянскіх гаспадарках. Згодна гэтае пастановы, сельсаветы абавязаны: весьці сталы падлік сялянскіх гаспадарак, якія ўжываюць наймовую працу, наглядаць за тым, каб у дагаворах сельгасрабочых і батракоў з наймальнікамі быў прадугледжаны парадак вызваленьня наймальнікам рабочага ад працы для наведваньня вячэрніх школ, пунктаў ліквідацыі няпісьменнасьці, а таксама было прадугледжана аслабаненьне рабочага для выкананьня дэпутацкіх абавязкаў (для тых рабочых, якія абраны ў склад савету) і г. д.

Наркамправы павінен у 1929-30 годзе павялічыць лік сельска-гаспадарчых інспэктароў у 2 разы ў параўнаньні з 1928-29 бюджэтным годам. Акрвыканкомы павінны арганізаваць камісіі працы пры тых сельсаветах, на тэрыторыі якіх ёсьць больш 100 батракоў і іншых сель.-гас. рабочых.

## Уцягненьне дэмабілізаваных чырвонаармейцаў у калгаснае будаўніцтва

ЦВК і СНК БССР разаслалі ўсім акрвыканкомам Наркамзему, Белсельтрэсту, Белкалгассаюзу і інш. цыркуляр аб уцягненьні дэмабілізаваных чырвонаармейцаў і малодшага начальніцкага складу ў калгаснае будаўніцтва на вёсцы.

Адпаведныя савецкія органы павінны ўсямерна дапамагаць арганізацыі новых калгасаў з дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, а таксама ўваходжаньню іх у існуючыя сельска-гаспадарчыя калектывы. Дэмабілізаваныя чырвонаармейцы атрымліваюць у пазачарговым парадку зямельныя вучасткі з дзяржфонду, крэдытаваньне і г. д.

# ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— ДОМ АСЬВЕТЫ. Сёньня 18 чэрвеня замест чарговага сходу ячэйкі КП(б)Б працасьветы будуць працавць гурткі па распрацоўцы пастаноў XII зьезду КП(б)Б. Пачатак а 7 гадзіне увечары. Яўка абавязкова.

— ДОМ АСЬВЕТЫ. У сераду 19 чэрвеня, роўна а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца сход тэх. працаўнікоў саюзу працасьветы з наступным парадкам дня:

1. Даклад аб 5-гадовым плане разьвіцьця народнай гаспадаркі.

2. Выбары з эксаўрсантаў для паездкі ў далёкія экскурсіі.

Яўка ўсіх абавязкова.

— Жанадзел Кастрычнікавага райкому КП(б)Б паведамляе, што агульна-гарадзкі сход работніц усіх груп склікаецца на сераду 19-га чэрвеня г. г. роўна а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу імя Леніна (былая «Чырвоная Заля») вул. Урыцкага.

Яўка ўсіх дэлегатак абавязкова. Пасьля сходу—кіно.

— Мен. АКК паведамляе, што 19 чэрвеня, а 12 гадз. дня, у памяшканьні АКК (малая заля клюбу Карла Маркса) адбудзецца інструкцыйная нарада членаў праверкомаў па праверцы і чыстцы партыі.

Яўка абавязкова.

— Кастрычнікавы райком КП(б)Б паведамляе, што у сераду 19-га чэрвеня г. г. а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні РК склікаецца рабочая адборчая камісія па прыёме ў вячэрні камвуз. Усе т.т., запоўніўшыя анкеты і жадаючыя займацца, павінны зьявіцца без спазьненьня.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ


# ТЭАТР і КІНО

ГАСТРОЛІ ленінградскага „КРАСНОГО ТЕАТРА"

ТЭАТР „ПРАФІКТЭРН" Аўторак, 18-га чэрвеня. „ХОЛЩЕВЫЕ ШТАНЫ" кам. у 4 д., Лебедзева.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА" сёньня і штодзенна новы буйны мастацкі баявік КАЛАМУТА кіно-аповесьць у 7 частках. Рэжысэр Г. Н. Тасін, Аператар М. Бельскі. Галоўныя ролі выконваюць арт. рэспублікі: І. В. Панаў, Н. Р. Таірава, Г. Ф. Зосімаў, Н. Н. Федаровіч. Пачатак роўна а 8 г. увеч. Каса—ад 5 г. увеч.

Кіно „Пралетары" МАСТАЦКА-ГІСТАРЫЧНЫ —ФІЛЬМ— ЭПОХІ КАЦЯРЫНЫ II-ой ПЭРЛА СЕМІРАМІДЫ драма ў 7 частках. Пачатак а 7 г. 30 м. Каса — ад 6 гадз.

КІНО «СПАРТАК» Ад аўторка, 18-га чэрвеня грандыёзны фільм „СТЕПАН ХАЛТУРИН" драма у 9-ці частках Каса—ад 6 гадз. | Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. 30 м.

КІНО-САД „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" ВЯЛІКІ МАСТАЦКІ БАЯВІК вытворч. „Межрабпом-фільм" Ад аўторка, 18 чэрвеня „ХРОМОЙ БАРИН" Па аповесьці А. ТАЛСТОГА Рэжысэр К. ЭГЕРТ у гал. ролі: В. МАЛІНОУСКАЯ вядомая па фільмах: „Коллежский регистратор", „Медвежья свадьба", „Человек из ресторана". 2 сэансы: пачатак 1-га—а 9 гадз., 2-га—а 10 г. 30 м. Каса—ад 7 гадз.

СЁНЬНЯ, аўторак 18 чэрвеня, і ЗАЎТРА, 19 чэрвеня ДЗЯРЖЦЫРК Апошнія дзьве гастролі

1-шы раз у БССР заслуж. арт. рэспублікі Грузіі Бр. ТАНЦІ

Апошняя гастроль адзінай у СССР трупы акрабатаў—прыгуноў Увесь цырк ашалёўрыў! 10 Океанос 10

Апошняя гастроль улюбенцаў Масквы клёўнаў - сатырыкаў АЛЬПЕРАВА І МАКСА

Апошняя гастроль 4 Юліанс 4 Галаваломныя трукі! Шэдэўр цыркмастацтва!

1-шы раз у Менску „Конкурс прыгунов"

1-шы раз у Менску Конкурс бічуючай сатыры цэнтральнай і мясцовай.

З прычыны вялізарнай праграмы, пачатак прадстаўленьня роўна а 9 гадз. увечары.

Кіно „Інтэрнацыянал" Сёньня, 18 чэрвеня і штодзенна — буйны мастацкі фільм — ЛАВІНА Кіно-аповесьць у 7 част. Пастаноўка вядом. рэжысэра І. Н. Пэрысьціані ГАЛОЎНЫЯ РОЛІ ВЫКОНВАЮЦЬ: Ніна Лі | Н. Папоў | І. Пэрысьціані Пачатак роўна а 7 гадз. 30 м. увеч. | Каса адкрыта ад 6 г.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ даставкі газэты „ЗЬВЯЗДА" звяндзе па тэл. 2-49

Не спажывайце алькагольных напіткаў, шкодных для здароўя.

ПЕЦЕ толькі КАУКАСКІЯ НАРЗАН Натуральныя Мінэральныя Воды ЭСЕНТУКІ № 20 Адзіныя сталовыя воды з натуральнай вуглякіслатой.

ЭСЕНТУКІ № 4, № 17, № 18 | БАТАЛІНСКАЯ СЬМІРНОУСКАЯ СЛАВЯНАУСКАЯ | БАРЖОМ

Са складу 25 % адпускаюцца па гуртавых цэнах з дармовай дастаўкай на дом.

Заказы вагонамі прымаюцца па зьніжаных цэнах і асобна ільготных умовах.

Патрабуйце ўсюды каўкаскія натуральныя мінэральныя воды!

Нарзан з кіёскаў прадаецца шклянкамі.

Раённы склад Белмэдгандлю: Менск, рог Савецкай і Энгельса 26-92, тэл. 374.

НАРЗАН ЭСЕНТУКІ № 20.

ЮЖХИМТРЕСТ ЛУЧШИЙ СОВЕТСКИЙ КАРАНДАШ ХИМСИНДИКАТ

ЛЯЧЭБНІЦА МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА МЭДЫКА-САНІТАРН. Т-ВА Ленінская (побач з 2-м Домам Саветаў), № 25, тэл. 12-66 АДКРЫТА ад 3 г. дня да 9 г. ув. Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутраных, жаночых, зубных, вонкавых, нервах, вуха, горла, носа і скуры Фізіятрычны габінэт: швары, электра і сьвета-лячэньне. Рэнтгенаўскі габінэт робіць здымкі, прасьвечваньні і лячэньне хворых Прыём хэміка-бактэрыял. аналізаў Кансультацыя прафэсароў—прыём хворых па лежачых кніжках таварыства

Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную плату.

АДПУСКВІКІ! НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПЕРАД АДЫХОДАМ —У ВОДПУСК ПАВЕДАМІЦЬ У— кантору газэты „ЗЬВЯЗДА" Савецкая, 63 тэл. 7-81 ВАШ НОВЫ АДРАС. Вам будзе пасылацца «ЗЬВЯЗДА» па месцы знаходжаньня ў водпуску без асобнай даплаты за перамену адрасу.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты лічыць несапраўднымі

Пашпарт № 15277 Швітман Х.-І. Д. Б., выд. Менскай міліц. 1895

Пашпарт Кінкулькін Э. Х., выд. Менскай міл. 1896

Талён-пасьведчаньне Тарасевка К. Д., выд. Сьвілацкім РВК аб арэндаваньні вучастку зямлі. 1897

Адрэзак „В", асабов. пасьведч. і разавы білет, выд. Менск. к-рай 8-га вуч. сл. цягі Пермскай чыг., чл. білет саюзу чыгунапчнікаў, асабовае пасьведчаньне, выд. Чусаўскай міліц., Уральскай обл. 1898-1901

Мэтрычнае пасьведчаньне Фрыд Б. М., выд. Сьмілавіц. РВК. 1902

Вуч.-конская кніжка Мельгуя У. М., выд. Засл'ўскім РВК. 1903

Членская кніжка № 882 Абрамовіча М. В., выд. «Самрамкрадытам». 1904

Два біржавыя талёны Сармант В. В., выд. Менскай біржай працы. 1905

Студэнцк. пасьведчаньне № 171 Гардзінай Г. М., выд. БДУ. 1906

Нумар да вэлёсыпэду № 1072 Валодзька Я. Т., выд. Белкамунбанкам. 1907

Вуч.-конская кніжка Васілеўскага Г., выд. Астраш.-Гарадзец. РВК. 1908

Кошт публікацыі 50 К. аб згубе дакуманту

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" звяндзе па тэл. 7-81

БЕЛАРУСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАМУ ТРЭСТУ патрабуюцца ДВА ВОПЫТНЫЯ ІНЖЫНЭРЫ Інжынэр-будаўнік і інжынэр-мэханік для капітальнага будаўніцтва і праектаваньня, са стажам 5—6 год. Аплата па згодзе. Прапановы з паказаньнем умоў, мыцьцяпісу, веетак аб асьвеце і водзыву аб ранейшай працы накіроўваць па адрасе: БССР, г. Менск, Савецкая 70, Белсельтрэсту.


Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

Друкарня газэты «Зьвязда». Менск